ЗВЯЗДА

● выдаецца са жніўня 1917 г. ● БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА ● кошт 3000 рублёў

1 ліпеня 1998 г. серада, № 134 (23485)

ДОЛЯ ЖЫЛЛЯ, ПАБУДАВАНАГА Ў СТУДЗЕНІ—МАІ ЗА ДЗЯРЖАЎНЫ КОШТ, СКЛАЛА 13 ПРАЦЭНТАЎ

Паводле даных Міністэрства статыстыкі і аналізу Беларусі, за пяць месяцаў гэтага года прадпрыемствамі і арганізацыямі ўсіх формаў уласнасці на будаўніцтва жылых дамоў было асвоена 7730 мільярдаў рублёў інвестыцый, што склала 26 працэнтаў ад іх агульнага аб'ёму.

У параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года аб'ём інвестыцый у жыллёвае будаўніцтва павялічыўся на 28 працэнтаў. На будаўніцтве жылых дамоў у сельскай мясцовасці асвоена 1079 мільярдаў рублёў інвестыцый, што складае 14 працэнтаў ад аб'ёму інвестыцый на жыллёвае будаўніцтва.

У студзені—маі ў рэспубліцы было здадзена ў эксплуатацыю 714 тысяч квадратных метраў жылля (за гэты ж перыяд мінулага года — 491 тысяча квадратных метраў). Доля жылля, пабудаванага за дзяржаўны кошт, склала 13 працэнтаў ад агульнай колькасці.

Наталля КУЛАГІНА, БелаПАН.

ДА 2004 ГОДА КОЖНЫ НАСЕЛЕНЫ ПУНКТ ГРОДЗЕНСКАЙ ВОБЛАСЦІ ПАВІНЕН МЕЦЬ СВОЙ ГЕРБ

У адпаведнасці з рашэннем Гродзенскага аблвыканкама, не толькі гарады, але і іншыя населеныя пункты Прынёманскага краю будуць мець свае гербы. Работа па стварэнню і размяшчэнню гербавых знакаў павінна завяршыцца да 2004 года.

Для іх распрацоўкі пры гарадскіх і раённых выканкамах ствараюцца спецыяльныя камісіі, якія павінны працаваць у цесным кантакце з геральдычнай службай Дзяржаўнага камітэта па архівах і справаводстве. Пры распрацоўцы гербавай сімволікі рэкамендавана ўлічваць народныя традыцыі і гісторыка-культурную спадчыну населеных пунктаў.

Ася КУНІЦКАЯ, БелаПАН.

У МІНЧАН — СВЯТА, А Ў ТРАНСПАРТУ — «АСАБЛІВЫ РЭЖЫМ»

3 і 4 ліпеня ў сталіцы пройдуць святочныя мерапрыемствы, прысвечаныя Дню Незалежнасці рэспублікі і святу горада. Як і летась, святкаванне зацягнецца да ночы, бо і салют, і феерверк намечаны на 23 гадзіны.

З пытаннем, як будзе арганізавана работа сталічнага транспарту ў гэты час і ці не прыйдзецца мінчанам, якія рызыкнуць палюбавацца грандыёзным відовішчам у самым цэнтры падзей, потым вяртацца дамоў пешшу, «Звязда» звярнулася ў вытворчае ўпраўленне транспарту і сувязі Мінгарвыканкама.

Як паведамілі нам у аддзеле арганізацыі пасажырскіх перавозак, з 3-га на 4-е і з 4-га на 5-е ліпеня работа аўтабусаў і тралейбусаў, маршруты якіх праходзяць у раёне праспектаў Машэрава, Скарыны, вуліц Бабруйскай, Багдановіча, Нямігі, Раманаўскай Слабады, плошчы Незалежнасці, чыгуначнага вакзала, будзе падоўжана да двух гадзін ночы. Затым, пасля трохгадзіннага перапынку, у 5 гадзін раніцы гэты транспарт зноў пачне сваю работу, таму ўсе мінчане, у якіх святкаванне крышачку зацягнулася, змогуць дачакацца першага транспартнага сродку.

Таксама Мінгарвыканкам звярнуўся да прыватнага прадпрыемства, якому належыць аўтапарк маршрутных таксі, з прапановай пасадзейнічаць ім у перавозцы мінчан у начныя гадзіны святочных дзён. Можна спадзявацца, што прыватнікаў гэта «ідэя» павінна зацікавіць...

Надзея НІКАЛАЕВА.

БЕЛАРУСКАЯ МОВА Ў ВНУ. ПАКУЛЬ З ЦЯЖКАСЦЯМІ

Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны выступіла са зваротам разгледзець на спецыяльнай калегіі Міністэрства адукацыі праблемы беларускамоўнага навучання ў ВНУ.

Як адзначаецца ў распаўсюджанай з гэтай нагоды заяве, прыкметнае ў апошні час звужэнне ўжывання беларускай мовы ў дзейнасці дзяржаўных органаў спрыяе ўсталяванню адносінаў да яе як да мовы «неперспектыўнай», што сур'ёзна адбіваецца на сітуацыі ў вышэйшых навучальных установах. Таму, каб забяспечыць сапраўдны прынцып двухмоўя, на думку Таварыства беларускай мовы, зараз Міністэрства адукацыі не павінна змяншаць у вучэбных планах ВНУ колькасць гадзін, адведзеных на выкладанне беларускай мовы і беларусазнаўства, распрацаваць дзяржаўную праграму «Беларускі падручнік для ВНУ», увесці абавязковы ўступны экзамен на беларускай мове, а таксама прадоўжыць вывучэнне мовы выкладчыкамі, якія ёй не валодаюць, на курсах павышэння кваліфікацыі з далейшай атэстацыяй. Паралельна з гэтым, улічваючы нацыянальнасць выпускнікоў менавіта беларускіх школ, ТБМ вырашыла прапанаваць міністэрству ў бліжэйшы час пачаць падрыхтоўку да адкрыцця нацыянальнага універсітэта з беларускай мовай навучання.

Сяргей ГРЫБ.

З ГЭТАГА ГОДА ПРЫЁМ У ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МЕДЫЦЫНСКІ ІНСТЫТУТ БУДЗЕ АЖЫЦЦЯЎЛЯЦЦА НА МЭТАВАЙ КАНТРАКТНАЙ АСНОВЕ

На мэтавай кантрактнай аснове будзе з гэтага года ажыццяўляцца прыём абітурыентаў у Гомельскі дзяржаўны медыцынскі інстытут. Гэтае сумеснае рашэнне Міністэрства адукацыі і Міністэрства аховы здароўя заклікана садзейнічаць паляпшэнню забеспячэння медыцынскімі кадрамі сельскіх раёнаў Гомельскай і Магілёўскай абласцей, якія найбольш пацярпелі ад аварыі на ЧАЭС.

З абітурыентам, які прайшоў па конкурсу, інстытут і наймальнік будуць заключаць кантракт, згодна з якім пасля заканчэння ВНУ будучы спецыяліст абавязаны адпрацаваць у канкрэтным раёне тры гады. Калі ж выпускнік адмовіцца выканаць гэтую ўмову, то ён павінен будзе кампенсаваць затрачаныя дзяржавай на яго навучанне сродкі — каля 12 тысяч долараў ЗША.

Ірына МАКАВЕЦКАЯ, БелаПАН.

«ХАЛЕРНЫ ПОЯС» ЗАЦЯГВАЕЦЦА ВАКОЛ БЕЛАРУСІ

Як паведамілі расійскія сродкі масавай інфармацыі, на бягучым тыдні ў Маскве быў зарэгістраваны другі ў гэтым годзе выпадак захворвання на халеру.

Па папярэдніх звестках, інфіцыраваны быў карэнны масквіч, які падхапіў заразную хваробу, нават не пакідаючы межаў горада, хутчэй за ўсё — ад іншага вірусаносьбіта. Трывожныя звесткі паступілі і з Украіны, дзе ў Марыупалі, Днепрапятроўскай і Запарожскай абласцях былі выяўлены вібрыёны халеры. З пытаннем, наколькі верагодна, што халера не абміне і нашу краіну, «Звязда» звярнулася да спецыялістаў Рэспубліканскага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі.

У аддзеле эпіднагляду за каранціннымі і асабліва небяспечнымі інфекцыямі нам паведамілі, што Беларусь зусім не застрахаваная ад пранікнення на яе тэрыторыю розных інфекцыйных хвароб, аб якіх беларусам больш вядома з матэрыялаў друку, чам з уласнага вопыту. Гэта тлумачыцца тым, што знаходзімся мы на геаграфічным скрыжаванні дарог і паветраных калідораў з Еўропы ў Азію і праз нашу краіну праходзіць такі людскі паток, што выявіць хворага чалавека яшчэ дзесьці пры перасячэнні ім мяжы не заўсёды магчыма. Аднак медыкі да такіх нечаканасцяў заўсёды падрыхтаваныя: па іх словах, дастаткова максімум пяці сутак, каб выявіць у падхапіўшага халеру яе наяўнасць. Як правіла, гэта адбываецца адразу па прыбыцці, і распаўсюдзіцца завезеная інфекцыя не паспявае.

Дарэчы, апошнія два гады халера Беларусь «не наведвала». А вось у 1995 годзе ў рэспубліцы былі зарэгістраваны адразу 3 выпадкі завезенай халеры.

Надзея НІКАЛАЕВА.

РАСІЯ ДВОЙЧЫ ПАЗБЕГЛА ПАЎТАРЭННЯ ЧАРНОБЫЛЯ

Апошнім часам у Расіі ўдалося прадухіліць дзве патэнцыяльныя катастрофы, якія па маштабу можна параўнаць з чарнобыльскай. Аб гэтым у інтэрв'ю штотыднёвіку «Інтэрфакс—АиФ» заявіў кіраўнік Міністэрства па надзвычайных сітуацыях (МНС) Сяргей Шойгу. Праўда, ён не палічыў магчымым удакладняць акалічнасці гэтых патэнцыяльных катастроф.

Паводле слоў кіраўніка МНС, тэндэнцыя да павелічэння колькасці розных аварый існуе ва ўсім свеце. Яна абумоўлена няспынным развіццём тэхнасферы. У гэтых адносінах, адзначыў С. Шойгу, у Расіі асабліва неспрыяльная яе еўрапейская частка, дзе размяшчаецца большая частка ваеннага патэнцыялу краіны.

Інтэрфакс.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПРЫНЯЎ ПРЭЗІДЭНТА КАНЦЭРНА ПА НАФЦЕ І ХІМІІ ІВАНА БАМБІЗУ

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка прыняў прэзідэнта Беларускага дзяржаўнага канцэрна па нафце і хіміі Івана Бамбізу з дакладам аб становішчы спраў у хімічным і нафтаперапрацоўчым комплексе рэспублікі.

Як паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе прэзідэнта, Іван Бамбіза праінфармаваў кіраўніка дзяржавы аб выніках работы галіны ў цэлым і ўсіх буйных прадпрыемстваў хімічнага і нафтаперапрацоўчага комплексу за І паўгоддзе 1998 года.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на неабходнасць забеспячэння галін народнай гаспадаркі гаруча-змазачнымі матэрыяламі і ў першую чаргу стварэння запасаў паліва для арганізаванага правядзення ўборачнай і на асенне-зімовы перыяд. Акрамя таго, прэзідэнт краіны даручыў узмацніць ролю дзяржавы на нафтавым рынку рэспублікі ў мэтах стабільнага забеспячэння нафтапрадуктамі і падтрымаў работу канцэрна ў частцы закупкі нафты дзяржавай.

У ходзе сустрэчы таксама былі абмеркаваны пытанні далейшай стратэгіі прадпрыемстваў хімічнага і нафтаперапрацоўчага комплексу рэспублікі. Іван Бамбіза далажыў прэзідэнту Беларусі аб стварэнні сумесных прадпрыемстваў у нафтаперапрацоўчай галіне з удзелам замежных інвестараў, а таксама міждзяржаўнай прамыслова-фінансавай групы з удзелам «Беларуськалія» і расійскіх вытворцаў калійных угнаенняў, расійскіх і беларускіх банкаў.

БЕЛТА.

УЗРОВЕНЬ ЗАКАНАТВОРЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ПАВІНЕН АДПАВЯДАЦЬ ПАТРАБАВАННЯМ ЧАСУ

Выступленне Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь П. У. ШЫПУКА на закрыцці чацвёртай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь (30 чэрвеня 1998 года)

Паважаныя члены Савета Рэспублікі і запрошаныя!

У адпаведнасці з артыкулам 98 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь чацвёртая сесія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь праходзіла з 2 красавіка па 30 чэрвеня 1998 года. У гэты перыяд адбылося 9 пленарных пасяджэнняў Савета Рэспублікі, на якіх адобраны 62 законапраекты, адхілена 6 і прынята 108 пастаноў. Адбыліся 3 сумесныя пасяджэнні з Палатай прадстаўнікоў. На адным з іх з Пасланнем да Нацыянальнага сходу звярнуўся Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка. У гэтым сапраўды праграмным дакуменце былі адзначаны пэўныя пазітыўныя перамены ў заканатворчым працэсе, узаемаадносінах кіраўніка дзяржавы, парламента і ўсіх галін дзяржаўнай улады. Аляксандр Рыгоравіч звярнуў увагу на тую акалічнасць, што заканатворчая дзейнасць яшчэ не дасягнула ўзроўню, які адпавядае патрабаванням цяперашняй сітуацыі. Пакуль яшчэ недастаткова ўвагі ўдзяляецца прыняццю законаў, якія комплексна рэгулююць тыя ці іншыя сферы грамадскіх адносінаў.

З адобраных намі законапраектаў трэба выдзеліць Водны кодэкс, а таксама законы аб Савеце Міністраў, аб Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенню рэспубліканскіх рэферэндумаў, аб адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзеле і парадку вырашэння пытанняў адміністрацыйна-тэрытарыяльнай будовы Рэспублікі Беларусь, аб Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, аб знешнім дзяржаўным доўгу, аб дзяржаўным прагназіраванні і праграмах сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь.

Чацвёртай сесіяй Савета Рэспублікі адобраны таксама шэраг іншых законапраектаў, у тым ліку аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у асобныя заканадаўчыя акты. Ратыфікавана 16 пагадненняў, дагавораў і пратаколаў паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і ўрадамі іншых дзяржаў, міжнародных канвенцый. Сярод найбольш важных — Венская канвенцыя аб грамадзянскай адказнасці за ядзерны ўрон ад 21 мая 1963 года; Канвенцыя ААН аб спецыяльных місіях 1969 года; Канвенцыя аб грамадзянскіх аспектах міжнароднага выкрадання дзяцей; Міжнародная канвенцыя аб барацьбе з вярбоўкай, выкарыстаннем, фінансаваннем і абучэннем наёмнікаў і іншыя.

У плане двухбаковых адносінаў ратыфікаваны міжнародныя дагаворы, якія рэгулююць самы шырокі спектр эканамічных, сацыяльных, гуманітарных, культурных, палітычных і іншых адносінаў з Кітаем, Чэхіяй, Літвой, ЗША, Турцыяй, Эстоніяй, Польшчай, Расіяй, Румыніяй, Індыяй, Балгарыяй, В'етнамам, Кубай, Казахстанам, Украінай, Бельгіяй, шэрагам іншых дзяржаў. Шэраг двухбаковых пагадненняў ратыфікаваныя другім бокам і ўжо ўступілі ў сілу. Гэта датычыцца асобных пагадненняў з Чэхіяй, Украінай, В'етнамам, Балгарыяй, Літвой, Кітаем, Польшчай, Казахстанам, Турцыяй, Кыргызстанам, Індыяй.

Гэтая акалічнасць не толькі сведчыць аб уступленні ў сілу ўказаных міжнародных дагавораў, але пацвярджае прызнанне з боку дзяржаўных органаў умапянёных краін законнасць дзеяння беларускага парламента па рэалізацыі сваіх паўнамоцтваў у міжнароднай прававой сферы.

Мы пачалі больш актыўна выкарыстоўваць і іншыя формы дзейнасці. У першую чаргу такую, як парламенцкія слуханні. Члены Савета Рэспублікі прынялі ўдзел у правядзенні парламенцкіх слуханняў «Праблемы ліквідацыі вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС і рэалізацыя Дзяржаўнай праграмы да 2000 года», «Аб развіцці прадпрымальніцтва Рэспублікі Беларусь», «Дзяржаўная нацыянальная праграма «Культура» і ўдасканаленне заканадаўчай базы галіны ў Рэспубліцы Беларусь», «Праблема правоў чалавека». З нашым актыўным удзелам прайшла навукова-практычная канферэнцыя «Аб удасканаленні заканадаўства Рэспублікі Беларусь і роля ў гэтым працэсе парламента». Семінар «Канстытуцыйныя асновы нацыянальнай бяспекі ў Рэспубліцы Беларусь» мы правялі ў Камітэце дзяржаўнай бяспекі рэспублікі. «Прававое забеспячэнне развіцця аграпрамысловага комплексу ва ўмовах рынкачных адносінаў» — такі семінар арганізаваны на базе агракамбіната «Сноў» Нясвіжскага раёна.

Больш актыўнымі сталі нашы ўзаемаадносіны з мясцовымі Саветамі дэпутатаў. Адбыліся сустрэчы са старшынямі абласных і раённых Саветаў дэпутатаў у Савеце Рэспублікі, у Інстытуце вышэйшых кіраўніцкіх кадраў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, а таксама сустрэча старшынь палат парламента з прадстаўнікамі абласных, раённых, гарадскіх, пасялковых і сельскіх Саветаў дэпутатаў.

(Заканчэнне на 2-й стар.).

МЫ ГРУНТОЎНА ПРАСУНУЛІСЯ НАПЕРАД У ВЫРАШЭННІ ПЫТАННЯЎ ДЗЯРЖАЎНАГА БУДАЎНІЦТВА

Заключнае слова аб выніках работы чацвёртай сесіі Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь А. А. МАЛАФЕЕВА

Паважаныя дэпутаты!

Паважаныя запрошаныя, журналісты!

Сёння, 30 чэрвеня 1998 года, у адпаведнасці з артыкулам 95 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь завяршае сваю работу чацвёртая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Час падвесці вынікі нашай работы. У цэлым, мяркую, яны станоўчыя. Хоць канчатковую адзнаку паставяць нашы выбаршчыкі, беларускі народ, інтарэсы якога мы прадстаўляем.

Арыенцірам для Палаты прадстаўнікоў стаў зварот Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі з пасланнем да парламента, у якім выкладзены стратэгія і тактыка развіцця нашай дзяржавы, вызначаны задачы на бліжэйшы час і перспектыву. Палажэнні і вывады, выкладзеныя ў ім, у многім спрыялі стварэнню збалансаванай сістэмы заканатворчай дзейнасці.

Праведзена 36 пленарных пасяджэнняў, у тым ліку 3 — разам з Саветам Рэспублікі. На пленарных пасяджэннях разгледжаны 203 пытанні. У першым чытанні прынята 46 законапраектаў. Галоўнай асаблівасцю цяперашняй сесіі стаў разгляд праектаў кадыфіцыраваных заканадаўчых актаў. У першым чытанні прыняты 5 праектаў кодэксаў: Грамадзянскі працэсуальны, Жыллёвы, Аб зямлі, Гаспадарчы працэсуальны, Паветраны.

Прыняты ў другім чытанні блок законапраектаў, якія рэгулююць эканамічную дзейнасць у краіне. Важнейшымі з іх з'яўляюцца праекты законаў: «Аб дзяржаўным прагназіраванні і праграмах сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь», «Аб аб'ектах, якія знаходзяцца толькі ва ўласнасці дзяржавы», «Аб энергазбераженні», «Аб асновах транспартнай дзейнасці», «Аб знешнім дзяржаўным доўгу Рэспублікі Беларусь» і іншыя. Прынцыповае значэнне мае прыняты ў другім чытанні законапраект «Аб Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі».

Мы грунтоўна прасунуліся наперад у вырашэнні пытанняў дзяржаўнага будаўніцтва. Законапраекты «Аб статусе дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь», «Аб Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь і падпарадкаваных яму дзяржаўных органах», «Аб Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенню рэспубліканскіх рэферэндумаў» дапаўняюць і канкрэтызуюць канстытуцыйныя палажэнні па гэтых пытаннях.

Усяго ў другім чытанні прыняты 63 законапраекты, у тым ліку праект Воднага кодэкса Рэспублікі Беларусь. Ратыфікавана 16 міжнародных дагавораў і пагадненняў.

Дзеючае заканадаўства Рэспублікі Беларусь нярэдка супярэчлівае, недастаткова сістэмнае. Розныя нарматыўныя акты паміж сабой не заўсёды ўзгоднены, што абцяжарвае іх правапрымяняльную практыку. У сувязі з гэтым сесіяй праводзілася работа па сістэматызацыі заканадаўства, унясенню змяненняў і дапаўненняў у дзеючыя заканадаўчыя акты, прывядзенню іх у адпаведнасць з патрабаваннямі новай рэдакцыі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

Характэрнай асаблівасцю цяперашняй сесіі з'явілася правядзенне 4 парламенцкіх слуханняў, значнасць якіх у заканатворчай дзейнасці неаспрэчна вялікая. Удзел у дыскусіях па разглядаемых праблемах вядомых вучоных, спецыялістаў адпаведных галін, прадстаўнікоў грамадскасці дае магчымасць прадставіць шырокі спектр меркаванняў і прымяніць выказваемыя ідэі ў заканатворчым працэсе, прыцягнуць увагу ўрада, грамадскіх арганізацый, сродкаў масавай інфармацыі да разглядаемых праблем, намеціць меры па іх вырашэнню.

Значны грамадскі рэзананс атрымалі парламенцкія слуханні па праблеме правоў чалавека. Іх правядзенне выклікана не нейкімі асаблівымі ўмовамі, што склаліся ў нашай дзяржаве ў галіне правоў чалавека, і не юбілейнымі абставінамі ў сувязі з адзначаемым у гэтым годзе 50-годдзем Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, а з'явілася яшчэ адным пацвярджэннем таго, што чалавек, яго правы, свабоды і гарантыі іх рэалізацыі на справе з'яўляюцца вышэйшай каштоўнасцю і мэтай грамадства і дзяржавы.

Асаблівае месца ў рабоце сесіі занялі пытанні новай заканатворчай практыкі парламента — разгляд дэкрэтаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, якія маюць сілу Закона. Няграла пытанняў узнікала па працэдуры пры разглядзе часовых дэкрэтаў прэзідэнта. Па прычыне гэтага ўзрастае актуальнасць прыняцця Закона аб нарматыўна-прававых актах Рэспублікі Беларусь, што дазволіць ажыццяўляць дакладны парадак падрыхтоўкі законапраектаў і іншых нарматыўна-прававых дакументаў.

У адпаведнасці з артыкулам 226 Рэгламента Палата прадстаўнікоў ажыццяўляе сваю кантрольную функцыю шляхам правядзення пленарных пасяджэнняў па адказах урада на пытанні дэпутатаў. Такіх пасяджэнняў было праведзена 2, адно з іх — па пытаннях грашова-крэдытнай палітыкі — закрытае.

(Заканчэнне на 3-й стар.).

БОЛЬШ 80 ПАДПІСЧЫКАЎ «ЗВЯЗДЫ» СТАЛІ ЎЛАДАЛЬНІКАМІ ПРЫЗОЎ ГАЗЕТЫ. ВІНШУЕМ! ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ!

Таццяна ДРАГУНОВА, работніца Мінскага прыборабудаўнічага завода, з прызамі «Звязды».
Фота Мікалая АМЕЛЬЧАНКІ.

СЁННЯ ВЫ, паважаныя чытачы, атрымалі першы нумар «Звязды» другога паўгоддзя. Цяпер ужо можна казаць, што нягледзячы на ўсе фінансавыя цяжкасці, звязаныя, як звычайна, з больш высокімі летнімі расходамі, амаль усе нашы сябры засталіся з намі. Гэта радуе, але і прымушае рабіць газету, якая б была добрым сямейным дарадцам. Спадзяёмся, што для вас, хто трымае сённяшнюю «Звязду» ў руках, яна сапраўды з'яўляецца жаданым госцем у доме. Прынамсі, мы шчыра імкнёмся несці вам самую аператыўную, самую неабходную, на наш погляд, інфармацыю, якая надавала б вам сілы і ўпэўненасць у заўтрашнім дні. Дарэчы, менавіта сямейнасць і шчырасць адзначыла ў гутарцы па тэлефоне Лідзія Мікалаеўна, жонка Пятра Марчанкі з Магілёва, які стаў уладальнікам прыза «Звязды» — электрадрылі. Пётр Міхайлавіч на пенсіі, але яшчэ працуе, а Лідзія Мікалаеўна даглядае хворую маці. «Звязду» выпісваюць даўно. Цікавяцца тым, як «Звязда» асвятляе тыя ці іншыя падзеі, якія адбываюцца ў краіне, адзначаючы пры гэтым, што, паверце, вельмі прыемна было чуць, сумленнасць і прынцыповасць ацэнак журналістамі газеты таго ці іншага факта. А вось парады, якія датычацца здароўя, вядзення хатняй гаспадаркі, яны непасрэдна выкарыстоўваюць на практыцы.

Кухонную электрамеханічную машыну выйграла педагог-арганізатар з в. Пухавічы Пухавіцкага раёна Ганна Гуткоўская. Яна працуе педагогам-арганізатарам у Мар'інай Горцы, але зараз даглядае паўтарагадовае дзіця. Таму звяздоўскі выйгрыш, па яе словах, Ганна Валянцінаўна ўспрыняла з вялікай радасцю. Яшчэ б! Гэтая кухонная машына можа працаваць як і мясарубка, і шынкоўка, і сокавыціскалка. Па сямейнай традыцыі, перададзенай бацькамі, яна і далей будзе прыхільніцай «Звязды». «Адчуваю ад яе цеплыню і нейкую пяшчотнасць», — прызналася Ганна.

Больш трыццаці гадоў выпісвае «Звязду» Харытон Фёдаравіч Шэўчык з Мікашэвічаў. Калісьці камсамольскія лідэры прымусілі яго падпісацца на газету. «Цяпер не ўяўляю без яе жыцця», — гаварыў па тэлефоне Харытон Фёдаравіч, калі даведаўся, што стаў уладальнікам электрамясарубкі. І трэба ж такое супадзенне (але латарэя ёсць латарэя!): другі раз выйграе — удзельнічаючы ў розыгрышы па выніках падпіскі на першае паўгоддзе мінулага года ён выйграў электрадрыль. З карысцю слухаў я выказванні Харытона Фёдаравіча, шчаслівага падпісчыка «Звязды» з вялікім стажам, пра якасць газеты. Вялікі аматар футбола, ён прасіў больш асвятляць праблемы беларускага спорту, расказваць пра вядучых спартсменаў краіны. Што ж, пажаданні чытачоў для нас — закон.

Ніна Уладзіміраўна Рак настаўніцае ў вёсцы Зубкі Клецкага раёна. Мае траіх дзяцей, двое з якіх ужо стварылі свае сем'і. Праўда, дачка і зараз побач, гадуе на радасць бубулі маленькага нашчадка. Шчыра скажу, парадаваўся, што ў такую па сённяшніх мерках вялікую сям'ю трапіў галоўны — жывы — прыз «Звязды» — парачка парсючкоў для дарошчвання. Ведаючы, што большасць нашых падпісчыкаў жыве ў сельскай мясцовасці, яго прадаставіла, як і раней, Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання. Дарэчы, калі супрацоўнікі міністэрства цікавяцца ў нас, а робіцца гэта заўсёды, хто выйграў жывы прыз, мы ўпэўнена адказваем: «Працавітыя, дастойныя людзі». І, паверце, гэта сапраўды так: такое ўражанне, што «Звязду» чытаюць добрыя людзі. Дай Бог, каб так было і надалей, каб мы разам, і чытачы, і журналісты, рабілі наша жыццё лепшым, сапраўды дастойным людзей, якія жывуць на нашай беларускай зямлі. Дзеля гэтага, пагадзіцеся, трэба жыць, гэтаму трэба верыць, гэтага трэба дабівацца. Менавіта такія пажаданні хацелася б выказаць сёння, напярэдадні вялікага Свята — Дня вызвалення рэспублікі. У першую чаргу тым, хто абараняў сваю краіну, хто дае нам, маладзейшым, упэўненасць і сілу. Нездарма ж у народзе кажуць: пакуль жывыя людзі, якіх мы зможам называць бацькамі, датуль мы расцём, разумнеем, набіраемся моцы. Здароўя вам, ветэраны, доўгіх гадоў жыцця: а вам, маладыя чытачы, — шчасця і ўдачы, павагі да сталых людзей і падтрымкі ад іх, сіл у пераадоленні сённяшніх цяжкасцей і добрых перспектыў, якія вы, зразумела, будуеце самі.

А цяпер паведамляем пераможцаў розыгрышу прызоў «Звязды», які адбыўся ўчора. Дарэчы, «Звязда» засталася вернай сваім прынцыпам, прапагандуючы прадукцыю айчынных прадпрыемстваў.

(Заканчэнне на 3-й стар.).

УКАЗ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ № 348

Аб стварэнні Інстытута перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі суддзяў, работнікаў пракуратуры, судоў і ўстаноў юстыцыі

У мэтах забеспячэння перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі суддзяў, работнікаў пракуратуры, судоў і ўстаноў юстыцыі **пастанаўляю:**

1. Стварыць у Беларускім дзяржаўным універсітэце Інстытут перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі суддзяў, работнікаў пракуратуры, судоў і ўстаноў юстыцыі (далей — Інстытут) як вучэбны, навуковы і метадычны цэнтр з суадносінамі прафесарска-выкладчыцкага саставу да саставу слухачоў 1:5.

Аплату працы работнікаў Інстытута ажыццяўляць па нарматывах, устаноўленых для адпаведных катэгорый работнікаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

2. Беларускаму дзяржаўнаму універсітэту да 1 верасня 1998 г. распрацаваць і зацвердзіць статут Інстытута.

3. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь:

3.1. да 1 верасня 1998 г.:

вырашыць ва ўстаноўленым парадку пытанні, звязаныя з фінансавым, матэрыяльна-тэхнічным і іншым забеспячэннем Інстытута;

вывучыць пытанне падрыхтоўкі юрыдычных кадраў у навучальных установах рэспублікі (уключаючы недзяржаўныя) і прыняць рашэнне аб далейшай іх дзейнасці;

3.2. да 1 кастрычніка 1998 г. унесці Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь прапановы аб стварэнні ў Беларускім дзяржаўным універсітэце каледжа па падрыхтоўцы работнікаў апаратаў судоў, органаў юстыцыі і пракуратуры;

3.3. прывесці акты ўрада і падведамных яму рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання ў адпаведнасць з гэтым Указам.

4. Кіраўніцтву справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь да 1 ліпеня 1998 г.:

перадаць на баланс Беларускага дзяржаўнага універсітэта адміністрацыйны будынак па вул. Савецкай, 14, у г. Мінску для размяшчэння ў ім Інстытута;

вырашыць пытанне аб прадастаўленні Інстытуту будынка для пражывання слухачоў.

5. Нацыянальнаму цэнтру прававой інфармацыі стварыць у 1998—1999 гадах у Інстытуце інфармацыйна-тэлекамунікацыйную сістэму прававой інфармацыі.

6. Прызнаць страціўшым сілу пункт 5 Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 4 снежня 1997 г. № 625 «Аб упарадкаванні аплаты працы суддзяў, матэрыяльна-тэхнічным і кадравым забеспячэнні судоў Рэспублікі Беларусь» (Збор дэкрэтаў, указаў Прэзідэнта і пастаноў Урада Рэспублікі Беларусь, 1997 г., № 34, арт. 1070).

7. Гэты Указ уступае ў сілу з дня яго падпісання.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь
А. ЛУКАШЭНКА.

30 чэрвеня 1998 г.
г. Мінск.

Чатыры ў таксі і сабака.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

УСМІХНЕМСЯ!

Самалёт, трап, праваднiца. Вусаты, гарбаносы чалавек у чапаеўскай бурцы цягне барана, узваліўшы яго на плечы.

— Вы куды з бараном?

— Вах! З якім бараном?! Гэта магарыч! Баран у Маскве, у інстытуце вучыцца.

❑

Бабулька з цікавасцю разглядае дзіцячую каляску:

— Якія прыгожыя блізняткі! Хлопчыкі?

— Той, каторы злева, — адказвае маладая мама. — Справа — гарбуз.

Малюнак Аркадзя САЛТЫКОВА.

ПРЭЗІДЭНТ КРАІНЫ ПАВІНШАВАЎ МІХАІЛА ДЗЯЛЬЦА З ЮБІЛЕЕМ

Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка даслаў свае самыя сардэчныя віншаванні Міхаілу Іванавічу Дзяльцу з нагоды слаўнай даты ў яго жыцці — 80-годдзя з дня нараджэння.

«Адлік Вашай працоўнай дзейнасці ў сферы друку пачынаецца з пасляваеннага 1946 года, калі Вы ўзначальвалі карэспандэнцкую сетку БЕЛТА, — гаворыцца ў віншаванні кіраўніка дзяржавы. — Адказным і творчым стаўленнем да друкаванага слова, самаадданай і нястомнай працай вызначаецца ўвесь Ваш далейшы працоўны шлях — ад адказнага сакратара Баранавіцкай аб'яднанай газеты «Чырвоная звязда» да старшыні Дзяржаўнага камітэта па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Менавіта гэты перыяд развіцця кнігавыдавецкай і паліграфічнай справы ў рэспубліцы характарызуецца значнымі дасягненнямі, якія і сёння забяспечваюць належныя ўмовы для паспяховага функцыянавання ўсяго выдавецка-паліграфічнага комплексу рэспублікі».

Міхаіл Іванавіч карыстаецца вялікім аўтарытэтам і павагай сярод журналістаў, грамадскіх арганізацый, з'яўляецца членам прэзідыума Беларускай рэспубліканскай арганізацыі ветэранаў вайны, працы, Узброеных Сіл і праваахоўных органаў. Радзіма па заслугах ацаніла яго працоўныя і ратныя поспехі.

Аляксандр Лукашэнка пажадаў юбіляру моцнага здароўя на доўгія гады, плёну ў грамадскай дзейнасці, а таксама шчасця яму і яго родным.

БЕЛТА.

КУРСЫ АБМЕНУ НАЯЎНЫХ ВАЛЮТ У КАМЕРЦЫЙНЫХ БАНКАХ І АФІЦЫЙНЫ КУРС, УСТАНОЎЛЕНЫ НАЦЫЯНАЛЬНЫМ БАНКАМ НА 30 ЧЭРВЕНЯ 1998 г. (па стану на 15.00)

Назва банка	USD		DM		RUR		Тэлефон для даведак
	Купля	Продаж	Купля	Продаж	Купля	Продаж	
Мінск (0-17)							
Белпрамбудбанк	50000	53000	27700	29500	8000	8500	233-2110
Мінсккомплексбанк	50000	54000	27500	29700	8000	8650	228-2047
Пріорбанк	50000	55000	27500	30200	8000	8800	245-5721
Нацыянальны банк РБ (курс для безнаяўных разлікаў)	37700.00		20848.31		6040.00		Курс на 1.07.1998
Цэнтрабанк Расіі	6.2000		3.4292				

На працягу дня ўстаноўленыя курсы могуць мяняцца, курсы галаўнога ўпраўлення банка могуць неістотна адрозніваццца ад курсаў, устаноўленых у абменных пунктах. Інфармацыя атрымана ад галаўных упраўленняў негандлёвых аперацый адпаведных банкаў.

Агенцтва ГРАЎЦОВА.

	USD		DM		RUR		
Рынкавы намінальны курс (міжбанкаўскі рынак)	67000	69000	37082	38189	10753	11077	
Рэальнаабгрунтаваны намінальны курс (прыблізна)	62000	62500	34200	34700	9700	10200	

НАЙМЕНШЫ ЎЗРОВЕНЬ АПЛАТЫ ПРАЦЫ СЯРОД КРАІН БАЛТЫІ — У ЛАТВІІ

Паводле даных Дзяржаўнага камітэта па статыстыцы Латвіі, у красавіку гэтага года памер мінімальнай заработнай платы ў рэспубліцы складаў 70,47 долара, у той час як у Літве ён дасягаў 75,9, а ў Эстоніі — 100 долараў.

У параўнанні з красавіком мінулага года мінімальная заработная плата ў Латвіі вырасла на 10,1 працэнта, у Літве — на 21 працэнт, а ў Эстоніі — на 30,2 працэнта.

Памер сярэдняй месячнай зарплаты ў Латвіі ў красавіку гэтага года склаў 203,57 долара, у Літве ж ён дасягнуў 230,71, а ў Эстоніі — 257,19 долара.

Інтэрфакс.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

НАДЗЁННАЕ

РОЗГАЛАС

ХТО КУПІЦЬ АКЦЫІ ЗА ГРОШЫ?

Днямі Міндзяржмаёмасць вырашыла правесці першы аўкцыён, на якім будуць прадавацца акцыі прыватызаваных прадпрыемстваў краіны за грошы.

Па словах начальніка Галоўнага ўпраўлення абарачэння каштоўных папер Зінаіды Шаўчэнка, гэты аўкцыён павінен адбыцца 26 жніўня. На ім Міндзяржмаёмасць выставіць на продаж 370 тысяч акцый 37 акцыянерных таварыстваў рэспублікі. Па меркаванню Зінаіды Семёнаўны, акцыі шэрагу прадпрыемстваў павінны знайсці на гэтым аўкцыёне сваіх пакупнікоў. Неблагім попытам, па словах суразмоўцы, будуць карыстацца акцыі двух камбінатаў хлебапрадуктаў, цукрарафінаднага камбіната, панчошнага кабіната і прадпрыемства «Аўтасервіс» (г. Гродна). У аўкцыёне маюць права прыняць удзел любыя суб'екты прыватызацыі, у тым ліку фізічныя і юрыдычныя асобы і замежныя інвестары. Пакуль яшчэ невядома, якой будзе пачатковая цана акцыі, але хутчэй за ўсё яна значна перавысіць яе намінальны кошт.

Сяргей КУРКАЧ.

ПРАМЫСЛОВЫЯ ПРАФСАЮЗЫ ВЫЙДУЦЬ НА ВУЛІЦЫ МІНСКА?

Прадстаўнікі адразу пяці галіновых прафсаюзаў прамысловасці (аўтасельгасмаша, радыёэлектронікі, металістаў, энергетыкі і «абаронкі») выказалі намер правесці 15 ліпеня мітынг пратэсту з мэтай прыцягнуць увагу органаў дзяржаўнай улады да рэзкага падзення ўзроўню жыцця ў краіне, парушэнняў працоўных правоў і гарантый работнікаў, а таксама да невыканання Генеральнага пагаднення паміж урадам, наймальнікамі і прафсаюзамі.

Варта нагадаць, што рашэнне аб пачатку масавых акцый пратэсту пад гэтымі ж лозунгамі было прынята на Рэспубліканскім сходзе працоўных калектываў і прафсаюзных арганізацый прыкладна месяц таму. Асноўныя дзеянні планаваліся на восень, аднак ужо тады некаторыя галіновыя прафсаюзы папярэдзілі аб магчымасці масавага выхаду на плошчы значна раней. Дарэчы, паводле заявы арганізатараў прафсаюзнага мітынгу 15 ліпеня, удзел у ім могуць прыняць да 10 тысяч рабочых прадпрыемстваў сталіцы.

Сяргей ГРЫБ.

ГУЛЯЙ ДУША, ВЕСЯЛІСЯ НАРОД!

Праграма святочных мерапрыемстваў, прысвечаных Дню незалежнасці Беларусі, святу горада Мінскім гарвыканкамам ужо зацверджана. Што называецца, абвяшчаем увесь спіс...

Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» начальнік прэс-службы Мінгарвыканкама Віктар Шымолін, афіцыйныя ўрачыстасці пачнуцца 2 ліпеня з ускладання вянкоў да абеліска на плошчы Перамогі і працягнуцца вечарам святочным канцэртам, прысвечаным Дню незалежнасці, які адбудзецца ў Нацыянальным акадэмічным тэатры оперы і балета. Трэцяга ж ліпеня будзе днём, насычаным культурнай праграмай, як кажуць, «пад завязку». З 10.00 да 12.00 на плошчы Незалежнасці пройдзе ваенны парад і маладзёжнае спартыўнае шэсце, у 14.00 у Нацыянальным музеі культуры і гісторыі Беларусі адкрыецца выстава «Масква і масквічы», а з 15.00 да 16.00 удзельнікі рэспубліканскага фестывалю «Беларусь — мая песня» парадуюць гледачоў сваім тэатралізаваным спектаклем. Вечарам 3-га таксама сумаваць не давядзецца: пасля таго як на плошчы Перамогі пройдзе мітынг-рэквіем «Памятаем Ваш подзвіг», народ можа смела накіроўвацца на Кастрычніцкую плошчу, дзе перад публікай з сімвалічнай праграмай «Для вас, земляки!» выступіць папулярная эстрадная спявачка Алёна Свірыдава (праўда, зараз расійская). У 23.00 у гонар Дня незалежнасці адбудзецца святочны салют.

4 і 5 ліпеня дзень горада будуць адзначаць мінчане (натуральным чынам, ніхто не забараняе ў гэтыя дні працягваць і святкаванне Дня незалежнасці). Святкаванні пачнуцца 4 ліпеня ў 11 гадзін раніцы на Кастрычніцкай плошчы з мастацкага паказу творчых калектываў горада (вечарам на гэтым жа месцы пройдзе выступленне канцэртнага аркестра пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга). Каля Палаца спорту аматараў піва чакае свята «Смага-98» (свята, якое, трэба зазначыць, заўсёды праходзіла з «творчым» падыходам народа), а на рацэ Свіслач адбудзецца спартыўнае мерапрыемства. Завершыцца дзень усё ля таго ж Палаца спорту канцэртам і святочным феерверкам. 5 ліпеня з 11.00 да 14.00 пройдзе фальклорны паказ, а вечарам — заключны гала-канцэрт лаўрэатаў рэспубліканскага фестывалю «Беларусь — мая вясна».

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

АД РАССТРЭЛУ НЕ ЎЦЁК

Магчыма, чытачы памятаюць пра адчайныя ўцёкі са следчага ізалятара ў Брэсце 12 абвінавачваемых. Тады падазраваемыя ў злачынствах разабралі сцяну і ўцяклі. Іх хутка злавілі. Вярнулі ў ізалятар і Алега Кудраўцава, які ўцёк разам з іншымі.

І вось адбыўся суд, які прыгаварыў Кудраўцава да расстрэлу.

Браты Кудраўцавы і іх напарнік Казюка некалькі сутак «адпачывалі». Каталіся па горадзе на аўтамашыне ды пілі гарэлку, а затым вырашылі абрабаваць кватэру Ферапонтавай. Алег Кудраўцаў у яе бываў, бо жыў у свой час у гэтым пад'ездзе.

Святла ў кватэры не было, і бандыты вырашылі дзейнічаць. Манціроўкай узламалі дзверы і пачалі хапаць усё больш-менш каштоўнае. Знайшлі залатыя ўпрыгажэнні гаспадыні, сабралі ў кучу вопратку, розную апаратуру і толькі надумалі ўсё гэта вынесці, як у кватэру зайшла сваячка Ферапонтавай, якая ў яе жыла. Непаўналетняя Юля, відаць, нічога не паспела і падумаць, бо рабаўнікі адразу ж напалі на яе. Дзяўчыну забілі.

Калі бандыты з пакункамі нарабаванага спускаліся ўніз, з кватэры, у якой калісьці жыў А. Кудраўцаў, выглянула Ферапонтава і пачала крычаць. Зладзеям удалося ўцячы, яны пакінулі Брэст і дамовіліся, што забойства Юлі возьме на сябе той, каго першым затрымаюць. А іх праз некалькі сутак узялі ўсіх разам.

Браты хацелі віну за забойства ўзваліць на Казюку. Але следства выявіла, што забілі дзяўчыну двое — Валерый Казюка і Алег Кудраўцаў. Апошні ўжо тройчы пабываў у турме і разумеў, што на гэты раз расстрэлу яму не пазбегнуць. Але, разабраўшы разам з іншымі сцяну ізалятара, паспрабаваў...

Брэсцкі абласны суд прыгаварыў Юрыя Кудраўцава да 13 гадоў калоніі ўзмоцненага, Валерыя Казюку — да 15 гадоў калоніі строгага рэжыму, а завадатара Алега Кудраўцава — да расстрэлу.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

УЗРОВЕНЬ ЗАКАНАТВОРЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ПАВІНЕН АДПАВЯДАЦЬ ПАТРАБАВАННЯМ ЧАСУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

На падставе даручэнняў кіраўніка дзяржавы, дадзеных на рэспубліканскай нарадзе «Аб павышэнні эфектыўнасці работы выканаўчых і распарадчых органаў рэспублікі па вырашэнню задач эканамічнага і сацыяльна-культурнага будаўніцтва», Нацыянальнаму сходу трэба будзе разам з Адміністрацыяй Прэзідэнта распрацаваць канцэпцыю рэфарміравання мясцовага самакіравання і ўнесці яе на абмеркаванне Першага з'езда Саветаў дэпутатаў Рэспублікі Беларусь. У гэтым напрамку ўжо цяпер ідзе актыўная работа.

Працягвалася развіццё і ўмацаванне міжпарламенцкіх сувязяў. Рэзультатыўным стаў удзел членаў Савета Рэспублікі ў VIII сесіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі, якая адбылася ў Гомелі. Члены Савета Рэспублікі актыўна ўдзельнічалі ў рабоце Міжпарламенцкага Камітэта Беларусі, Казахстана, Кыргызстана і Расійскай Федэрацыі.

Сур'ёзная работа праведзена па лініі Міжпарламенцкай асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў. На адзінаццатым пасяджэнні МПА ў Санкт-Пецярбургу была падтрымана прапанова беларускай дэлегацыі аб стварэнні геапалітычнай групы «Усход—Захад» з парламенцкіх дэлегацый краін СНД. Гэта дазволіць больш эфектыўна дзейнічаць у пытаннях кадравай палітыкі і руху наперад нашых рэзалюцый у Міжпарламенцкім Саюзе і іншых міжнародных арганізацыях. «Еўразія» — так будзе называцца новае аб'яднанне.

У час адзінаццатага пасяджэння МПА адбылося таксама сумеснае пасяджэнне Савета Міжпарламенцкай асамблеі краін СНД і Бюро Парламенцкай Асамблеі АБСЕ. На ім абмяркоўваліся пытанні еўрапейскай бяспекі, актуальныя праблемы міжнароднай і рэгіянальнай палітыкі, якія маюць узаемную цікавасць.

Дзякуючы настойлівай і карпатлівай рабоце членаў Савета Рэспублікі Парламенцкая Асамблея АБСЕ прыняла рашэнне аб допуску на сваю сёмую штогадовую сесію прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу. З гэтага года члены Савета Рэспублікі ўваходзяць у састаў назіральнікаў за парламенцкімі выбарамі ў розных краінах (Украіна, Малдова, Чарнагорыя, Арменія, Чэхія).

Члены Савета Рэспублікі прымалі ўдзел у рабоце другога Эканамічнага форуму, які праходзіў у Санкт-Пецярбургу; пасяджэнне парламенцкага камітэта ЦЕІ, якое праводзілася па лініі Цэнтральна-Еўрапейскай Ініцыятывы; канферэнцыях Арганізацыі заканадаўцаў свету за збалансаванае навакольнае асяроддзе (ГЛОУБ), міжнародных канферэнцыях «Шэсць гадоў Садружнасці: праблемы і перспектывы»; «Новая архітэктура еўрапейскай бяспекі і НАТО»; «Жанчына. Сям'я. Здаровы лад жыцця».

У саставе афіцыйнай дэлегацыі нашай краіны на чале з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь я наведаў Югаславію і Егіпет. У саставе парламенцкай дэлегацыі Нацыянальнага сходу — Кітайскую Народную Рэспубліку. Адбыліся сустрэчы з кіраўнікамі парламентаў гэтых краін. Беларуская дэлегацыя ўдзельнічала таксама ва ўрачыстасцях, прысвечаных 120-й гадавіне вызвалення Балгарыі ад асманскага прыгнёту.

У рамках афіцыйнага візіту ў Рэспубліку Беларусь дэлегацыі Саюзнай Скупшчыны Югаславіі на чале са Старшынёй Веча Рэспублік Срджа Бажовічам у Савеце Рэспублікі адбылося падпісанне Пратакола аб супрацоўніцтве паміж Парламентам Рэспублікі Беларусь і Парламентам Саюзнай Рэспублікі Югаславія.

Па нашай ініцыятыве Парламенцкі Сход Саюза Беларусі і Расіі прыняў рашэнне правесці ў Мінску ў наступным годзе міжнародную канферэнцыю «Еўропа — наш агульны дом».

У Савеце Рэспублікі адбыліся сустрэчы з кіраўніком кансультатыўна-наглядальнай групы АБСЕ; Генеральным сакратаром Савета МПА; мітрапалітам швейцарскім — Экзархам Усяленскага Патрыярха ў Еўропе; пасламі Інданезіі, Пакістана, Югаславіі, Украіны; дэпутатамі Еўрапейскага парламента; дэпутатамі Нацыянальнага Савета Швейцарыі; намеснікам Старшыні ПАСЕ; дэпутатамі Савета Федэрацыі і Дзяржаўнай Думы Расіі. Намі атрыманы запрашэнні ад кіраўнікоў парламентаў Югаславіі, Пакістана, Расіі, Турцыі, Кыргызстана наведаць іх краіны з афіцыйным візітам. Усё гэта дае падставы сцвярджаць, што парламенты краін як блізкага, так і далёкага замежжа гатовы да канструктыўнага дыялога з Саветам Рэспублікі па наладжванню міжпарламенцкіх сувязяў.

Гэта толькі беглы пералік асноўных мерапрыемстваў, праведзеных намі за гэты перыяд у рамках рэалізацыі сваіх канстытуцыйных паўнамоцтваў. Больш падрабязна аб дзейнасці Савета Рэспублікі будзе расказана ў інфармацыйным весніку «Аб выніках работы чацвёртай сесіі Савета Рэспублікі».

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

Хаця перыяд паміж вясенняй і асенняй сесіямі ўмоўна называецца парламенцкімі канікуламі, але ў гэты час нас чакае значная работа па падрыхтоўцы да чарговай сесіі і планаванню нашай далейшай дзейнасці.

План першачарговых мерапрыемстваў на першае паўгоддзе, па якім мы працавалі, надаў нашай рабоце больш арганізаванасці, мэтанакіраванасці і дынамізму. Мяркую, у бліжэйшы час будзе падрыхтаваны аналагічны дакумент і на другое паўгоддзе.

Акрамя заканадаўчай дзейнасці, у бліжэйшы час мы павінны падрыхтавацца да міжнароднай канферэнцыі «Еўропа — наш агульны дом».

Неабходна таксама рэалізаваць ініцыятыву, прапанаваную Саветам Рэспублікі, аб стварэнні ў МПС геапалітычнай групы «Усход—Захад» у рамках падрыхтоўкі да 100-й канферэнцыі Міжпарламенцкага Саюза. Адна з вельмі важных і адказных задач, якія патрабуюць хуткага вырашэння, — аднаўленне нашых паўнамоцтваў у еўрапейскіх парламенцкіх арганізацыях.

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь і ўстаноўлены заканадаўствам прававы рэжым дазваляюць усім нам удзельнічаць у парламенцкай дзейнасці не ад выпадку да выпадку, эпізадычна, а пастаянна, у адпаведнасці з планам нашых мерапрыемстваў. Упэўнены, што пачаць больш актыўны рух у гэтым напрамку нам дапаможа адобраны сёння Закон «Аб статусе дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь».

Важнасць гэтага Закона цяжка пераацаніць. Перш за ўсё, з пункту гледжання замацавання абавязкаў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і членаў Савета Рэспублікі, формаў дзейнасці, а таксама ўдасканалення нашай работы, павышэння яе эфектыўнасці.

Выкарыстанне ўсяго комплексу правоў і абавязкаў, прадугледжаных гэтым Законам, дазволіць членам Савета Рэспублікі больш істотна ўплываць на своечасовае рашэнне эканамічных, сацыяльных і культурных праблем насельніцтва адпаведных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, будзе садзейнічаць іх далейшаму развіццю.

З гэтага часу важнай сферай дзейнасці членаў Савета Рэспублікі стане ўдзел у рабоце органаў мясцовага кіравання і самакіравання. Выкананне гэтага абавязку, прадугледжанага артыкулам 28 Закона аб статусе, дазволіць прааналізаваць становішча інстытута мясцовага самакіравання, прапанаваць метады і спосабы ўзаемадзеяння, аказваць значную падтрымку і садзейнічанне мясцовым Саветам дэпутатаў.

Паважаныя калегі!

Дзякую вам за плённую работу. Упэўнены, што вопыт, набыты ў ходзе папярэдніх і чацвёртай сесіі, якая заканчвае сваю работу, прафесійныя веды і шчыры клопат аб лёсе Радзімы дапамогуць нам у далейшым справіцца з тымі адказнымі задачамі, ад вырашэння якіх у многім залежыць дабрабыт нашых суайчыннікаў, а таксама міжнародны аўтарытэт Рэспублікі Беларусь.

Дзякуй за ўвагу.

КРЫМІНАЛ

ЛІЧБА «13» — НЕШЧАСЛІВАЯ І ДЛЯ ФАЛЬШЫВАМАНЕТЧЫКАЎ

Следчым падраздзяленнем УУС Віцебскага аблвыканкама ўзбуджана крымінальная справа ў адносінах да грамадзяніна Літвы і чатырох жыхароў Беларусі, якія займаліся падробкай і збытам фальшывых долараў і марак.

Вопыт у гэтай крымінальнай сферы «інтэрбрыгада» мела немалы. Паводле пярэдніх даных, зарэгістравана 13 эпізодаў іх злачыннай дзейнасці. Пры затрыманні ў фальшываманетчыкаў канфіскавана 11 тысяч 400 падробленых долараў ЗША і 100 марак.

Міхась БЕРАСТ.

КАНЕЦ КВАТЭРНЫХ ВАНДРОВАК НАВАПОЛАЦКІХ ЗЛАДЗЕЯЎ

У Наваполацкі суд накіравана крымінальная справа ў адносінах да чатырох мясцовых грамадзян.

Яны вельмі любілі наведваць чужыя кватэры. Аб'ядналіся ў злачынную групу навапалачане прыкладна год таму. За гэты час злачынцы паспелі абрабаваць 27 кватэр. Гэта тое, што даказана ў ходзе следства. «Выручка» кватэрных зладзеяў склала 370 мільёнаў рублёў.

Міхась БЕРАСТ.

З НАГОДЫ

ПРАЦЯГЛАСЦЬ ВОДПУСКАЎ ПАВЯЛІЧЫЦЦА. АЛЕ НЕ ГЭТЫМ ЛЕТАМ

Як вядома, з 6 студзеня гэтага года ў Беларусі з 15 да 18 дзён павялічана працягласць мінімальнага водпуску. Здавалася б, па логіцы, наступным крокам павінна было стаць рашэнне аб павелічэнні ўсіх астатніх водпускаў. Аднак працягу дагэтуль так і не адбылося. Каб высветліць, у чым справа, карэспандэнт «Звязды» сустрэўся з ***начальнікам юрыдычнага ўпраўлення Міністэрства працы Інесай ЧЫСЦЯКОВАЙ****.*

— Давайце паспрабуем разабрацца. Заканадаўства краіны ўсталёўвае цэлы шэраг т. з. дадатковых водпускаў — за беспярэрыўны працяглы стаж, за ненарміраваны працоўны дзень, за цяжкія і шкодныя ўмовы працы. Гэтыя дадатковыя водпускі сумуюцца з водпускам асноўным, працягласць якога для ўсіх складае 12 дзён. Схема як быццам нескладаная. Аднак што такое «мінімальны водпуск»?

— Асноўны водпуск можна лічыць чыста тэхнічным нарматывам, які выкарыстоўваецца толькі ў тым выпадку, калі чалавек мае права на які-небудзь від дадатковага водпуску. У той жа час існуе такое паняцце, як «мінімальны водпуск» — найменшы гарантаваны дзяржавай штогадовы адпачынак. Працягласць мінімальнага водпуску традыцыйна была крыху большай і, скажам, да нядаўняга часу яна складала 15 працоўных дзён. Сёлета (з улікам той акалічнасці, што з-за рэальных эканамічных умоў 15 дзён водпуску мелі па сутнасці ўсяго каля 60 тысяч «бюджэтнікаў») дзяржава вырашыла павялічыць мінімальны водпуск да 18 працоўных дзён.

— Але разам з тым працягласць асноўнага водпуску засталася ранейшай. І як вынік, новы, павялічаны, мінімальны водпуск як бы цалкам або часткова «паглынуў» правы некаторых катэгорый грамадзян на дадатковыя водпускі за стаж, ненарміраваны працоўны дзень, за ўмовы працы...

— Сапраўды, мы адразу сутыкнуліся з гэтай праблемай. Таму па даручэнню Савета Міністраў Міністэрствам працы сумесна з міністэрствамі юстыцыі, эканомікі, фінансаў і Федэрацыяй прафсаюзаў быў падрыхтаваны праект спецыяльнай урадавай пастановы. Пасля доўгіх дыскусій спыніліся на крыху аслабленым варыянце: за зыходны пункт пры суміраванні бяруцца 18 дзён. Разам з тым для тых грамадзян, хто валодае правам на дадатковы водпуск за працяглы стаж і за ненарміраваны працоўны дзень, устанаўліваецца абмежавальнік працягласці ў 24 дні. Дадатковыя ж водпускі за шкодныя і складаныя ўмовы працы прапаноўвалася суміраваць з 18 днямі поўнасцю, без усякіх абмежаванняў.

Аднак нават гэты, трэба прызнацца шчыра, прамежкавы варыянт аказаўся нам проста не па кішэні. Паводле разлікаў Міністэрства фінансаў, ён будзе каштаваць каля 4 млрд. рублёў. Такіх сродкаў у дзяржавы пакуль няма. Пасля даручэння Савета Міністраў распрацаваць новы парадак суміравання водпускаў да 1 жніўня наша рабочая група збіралася зноў. У выніку абмеркавання папярэдне сышліся на наступным: звярнуцца да ўрада з просьбай не прымаць ніякіх змен увогуле. Прынамсі, да таго часу, пакуль парламентарыі не прымуць у другім чытанні праект новага Працоўнага кодэкса.

— І калі гэта можа здарыцца?

— Хутчэй за ўсё, недзе ў кастрычніку-лістападзе гэтага года.

Гутарыў Сяргей ГРЫБ.

ГАРАНТЫІ МАЛАДЫМ СПЕЦЫЯЛІСТАМ

Кансультацыю дае намеснік загадчыка юрыдычнага аддзела Федэрацыі прафсаюзаў Святлана Смаглюк

Сёлета сын заканчвае БДПА. У свой час «Звязда» ўжо пісала аб умовах размеркавання, але мяне і сына найперш цікавіць іншае — якія гарантыі павінны прадастаўляцца маладому спецыялісту? І ці можа малады спецыяліст, калі яго не забяспечылі жыллём або зарплатай ніжэй пражытачнага мінімуму, датэрмінова скасаваць працоўны дагавор?

Э. ПЛЯЦ, г. Жодзіна.

Варта нагадаць, што, згодна з Палажэннем «Аб размеркаванні выпускнікоў дзяржаўных вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь», зацверджаным загадам Міністэрства адукацыі ад 20 чэрвеня 1997 года, выпускнік, які закончыў поўны курс навучання і накіраваны на работу камісіяй па персанальнаму размеркаванню, лічыцца маладым спецыялістам і абавязаны адпрацаваць па накіраванню на работу 2 гады з дня заключэння працоўнага дагавора паміж ім і наймальнікам.

Выпускніку, які атрымаў накіраванне, па заканчэнні навучальнай установы прадастаўляецца водпуск працягласцю ў адзін каляндарны месяц незалежна ад таго, калі ён меў апошнія канікулы ў навучальнай установе. За перыяд водпуску выплачваецца грашовая дапамога ў памеры месячнай стыпендыі, атрыманай у апошнім семестры, за кошт сродкаў прадпрыемства, арганізацыі ці ўстановы, куды выпускнік накіраваны на работу. Выпускнікам педагагічных спецыяльнасцяў выплачваецца грашовая дапамога з разліку месячнай стыпендыі, якую выпускнік атрымліваў у апошнім перад выпускам семестры за 45 каляндарных дзён за кошт сродкаў дзяржаўнага бюджэту. У гэты тэрмін уключаецца месячны водпуск, незалежна ад таго, калі выпускнік меў апошнія канікулы ў навучальнай установе. У тых выпадках, калі выпускнік не атрымліваў стыпендыі ў апошнім перад заканчэннем навучальнай установы семестры, адпаведная грашовая дапамога яму выплачваецца, зыходзячы з разліку сацыяльнай стыпендыі.

Выпускнікам вышэйшых і сярэдніх нацыянальных навучальных устаноў, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, за час водпуску апроч стыпендыі выплачваецца грашовая кампенсацыя за харчаванне, зыходзячы з устаноўленых нормаў. Выпускнікам з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без бацькоўскай апекі, пасля заканчэння навучальнай установы выдаецца адзенне, мяккі інвентар, абсталяванне і грашовая дапамога ў адпаведнасці з дзеючымі на гэты час пастановамі ўрада. У той жа час выпускнікам ВНУ і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, якія атрымалі магчымасць самастойнага працаўладкавання, грашовая дапамога за час водпуску не выплачваецца.

Згодна з Палажэннем аб размеркаванні, выпускнікам, якія будуць працаваць у іншай мясцовасці, гарантуюцца выплаты, прадугледжаныя заканадаўствам аб працы. Выпускнікі па прыбыцці на месца працы забяспечваюцца жыллём, прычым пры недастатковасці ўласнага жыллёвага фонду выканаўчыя і распарадчыя органы мясцовых Саветаў дэпутатаў, а таксама прадпрыемствы, арганізацыі, установы могуць арандаваць у асобных грамадзян памяшканні для маладых спецыялістаў, якія прыбылі на працу ў сельскую мясцовасць па персанальнаму размеркаванню. Прадпрыемствы, арганізацыі, установы могуць выдаваць маладым спецыялістам пазыкі на індывідуальнае будаўніцтва, набыццё мэблі і іншага жыллёва-бытавога і сельскагаспадарчага інвентару, прымаць без чаргі ў жыллёва-будаўнічыя кааператывы.

Трэба таксама мець на ўвазе, што наймальнікам, незалежна ад формы ўласнасці, не дазваляецца пераводзіць выпускнікоў на работу, якая не звязана з атрыманай спецыяльнасцю і кваліфікацыяй, на працягу 2 гадоў пасля заканчэння імі навучальнай установы.

Цяпер наконт другога вашага, Эмілія Паўлаўна, пытання. Ваш сын мае права скасаваць працоўны дагавор у тым выпадку, калі прадпрыемства, арганізацыя ці ўстанова не выконвае абавязкаў, якія былі агавораны пры прыёме на работу.

ІМЕМ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

ЗАКЛЮЧЭННЕ КАНСТЫТУЦЫЙНАГА СУДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

АБ АДПАВЕДНАСЦІ КАНСТЫТУЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ АРТЫКУЛА 246 КОДЭКСА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ АБ АДМІНІСТРАЦЫЙНЫХ ПРАВАПАРУШЭННЯХ

Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь у складзе старшынствуючага — Старшыні Канстытуцыйнага Суда Васілевіча Р.А., суддзяў Бойка Т.С., Вараб'я Г.А., Кенік К.І., Падгрушы В.В., Саркісавай Э.А., Філіпчык Р.І., Цікавенкі А.Г., Шабайлава В.І., Шышко Г.Б.

з удзелам прадстаўнікоў бакоў:

Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, унёсшага прапанову аб праверцы канстытуцыйнасці артыкула 246 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях: Гапонцавай А.А. - намесніка дырэктара Нацыянальнага цэнтра законапраектнай дзейнасці пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь;

Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь: Аляксандрава В.М. — намесніка старшыні Камісіі па заканадаўству Палаты прадстаўнікоў; Арлова Л.К. — загадчыка аддзела крымінальнага і адміністрацыйнага заканадаўства Упраўлення экспертызы законапраектаў Галоўнага экспертна-прававога ўпраўлення Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў;

Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь: Бурага У.В. — загадчыка аддзела грамадзянскага, сацыяльнага і гаспадарчага заканадаўства экспертна-прававога ўпраўлення Сакратарыята Савета Рэспублікі

разгледзеў у адкрытым судовым пасяджэнні справу «Аб адпаведнасці Канстытуцыі артыкула 246 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях».

У судовым пасяджэнні прынялі ўдзел: Пташнік У.М. — намеснік Старшыні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь; Ждановіч І.М. — намеснік Старшыні Вышэйшага Гаспадарчага Суда Рэспублікі Беларусь; Іваноўскі А.У. — намеснік Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь; Сяргеева В.Г. — намеснік міністра юстыцыі Рэспублікі Беларусь.

Вядзенне па справе ўзбуджана Канстытуцыйным Судом 19 мая 1998 года па прапанове Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на падставе артыкула 116 Канстытуцыі, артыкулаў 5 і 6 Закона «Аб Канстытуцыйным Судзе Рэспублікі Беларусь» і артыкула 43 Рэгламенту Канстытуцыйнага Суда.

Праверцы падлягаў артыкул 246 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях (ЗЗ БССР, 1984 г., № 35, арт.505). Згодна з указаным артыкулам адміністрацыйнае затрыманне, асабісты надгляд, надгляд рэчаў і адабранне рэчаў і дакументаў могуць быць абскарджаны зацікаўленай асобай у вышэйстаячы орган (службовай асобе) або пракурору.

У сваёй прапанове ў Канстытуцыйны Суд аб праверцы канстытуцыйнасці артыкула 246 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь указаў, у прыватнасці, што немагчымасць абскарджання затрымання ў судовым парадку ўваходзіць у супярэчнасць з артыкулам 25 Канстытуцыі, які прадугледжвае права асобы на судовую праверку законнасці яе затрымання, а таксама артыкулам 60 Канстытуцыі, які гарантуе кожнаму абарону яго правоў і свабод кампетэнтным, незалежным і непрадузятым судом.

Заслухаўшы суддзю-дакладчыка Падгрушу В.В., прадстаўнікоў бакоў, вывучыўшы матэрыялы справы, прааналізаваўшы адпаведныя палажэнні Канстытуцыі, Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях (у далейшым — КаАП), другіх законаў, а таксама міжнародна-прававых актаў, Канстытуцыйны Суд устанавіў наступнае.

Згодна з артыкулам 239 КаАП у выпадках, прама прадугледжаных заканадаўчымі актамі, у мэтах спынення адміністрацыйных правапарушэнняў, калі вычарпаны іншыя меры ўздзеяння, устанаўлення асобы, складання пратакола аб адміністрацыйным правапарушэнні пры немагчымасці складання яго на месцы, калі складанне пратакола з'яўляецца абавязковым, забеспячэння своечасовага і правільнага разгляду спраў і выканання пастаноў па справах аб адміністрацыйных правапарушэннях дапускаюцца адміністрацыйнае затрыманне асобы, асабісты надгляд, надгляд рэчаў і адабранне рэчаў і дакументаў.

Артыкулам 241 КаАП прадугледжана, што адміністрацыйнае затрыманне асобы, якая ўчыніла адміністрацыйнае правапарушэнне, можа праводзіцца ўпаўнаважанымі органамі (службовымі асобамі) у адпаведнасці з іх кампетэнцыяй (органамі ўнутраных спраў (міліцыі), пагранічнымі войскамі, старшай у месцы знаходжання ахоўваемага аб'екта службовай асобай ваенізаванай аховы, службовымі асобамі ваеннай аўтамабільнай інспекцыі, службовымі асобамі таможных органаў).

Згодна з артыкулам 242 КаАП адміністрацыйнае затрыманне асобы, якая ўчыніла адміністрацыйнае правапарушэнне, можа працягвацца не больш трох гадзін. У выключных выпадках, у сувязі з асаблівай неабходнасцю заканадаўчымі актамі могуць быць устаноўлены больш працяглыя тэрміны адміністрацыйнага затрымання.

У адпаведнасці з заканадаўствам адміністрацыйнае затрыманне з'яўляецца мерай адміністрацыйнага ўздзеяння, якая забяспечвае вядзенне па справах аб адміністрацыйных правапарушэннях. Па свайму характару адміністрацыйнае затрыманне, якое заключаецца ў прымусовым абмежаванні свабоды асобы на вызначаны тэрмін, закранае яе права на недатыкальнасць і годнасць.

Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека абвяшчае, што кожны чалавек мае права на свабоду і на асабістую недатыкальнасць (артыкул 3); ніхто не можа быць падвергнуты адвольнаму арышту або затрыманню (артыкул 9); кожны чалавек мае права на эфектыўнае аднаўленне ў правах кампетэнтнымі нацыянальнымі судамі ў выпадку парушэння яго асноўных правоў, якія прадастаўлены яму канстытуцыяй або законам (артыкул 8).

Міжнародным пактам аб грамадзянскіх і палітычных правах таксама прадугледжваецца, што кожны чалавек мае права на свабоду і асабістую недатыкальнасць і ніхто не можа быць падвергнуты адвольнаму арышту або ўтрыманню пад вартай; кожнаму, хто пазбаўлены свабоды з прычыны арышту або ўтрымання пад вартай, належыць права на разбор яго справы ў судзе, каб гэты суд мог неадкладна вынесці пастанову адносна законнасці яго затрымання і распарадзіцца аб яго вызваленні, калі затрыманне незаконнае (артыкул 9); кожная дзяржава, якая ўдзельнічае ў дадзеным Пакце, абавязуецца развіваць магчымасці судовай абароны (артыкул 2). Права на судовы разгляд законнасці затрымання гарантуецца артыкулам 9 Пакта незалежна ад характару затрымання.

Права кожнага чалавека на свабоду і асабістую недатыкальнасць, а таксама на судовую абарону ў выпадку затрымання адносіцца да агульнапрызнаных прынцыпаў і нормаў міжнароднага права.

Згодна з артыкулам 8 Канстытуцыі Рэспубліка Беларусь прызнае прыярытэт агульнапрызнаных прынцыпаў міжнароднага права і забяспечвае адпаведнасць ім заканадаўства. Артыкулам 21 Канстытуцыі прадугледжваецца, што забеспячэнне правоў і свабод грамадзян Рэспублікі Беларусь з'яўляецца вышэйшай мэтай дзяржавы. Дзяржава гарантуе правы і свабоды грамадзян Беларусі, замацаваныя ў Канстытуцыі, законах і прадугледжаныя міжнароднымі абавязкамі дзяржавы.

У адпаведнасці з артыкулам 25 Канстытуцыі дзяржава забяспечвае свабоду, недатыкальнасць і годнасць асобы. Абмежаванне або пазбаўленне асабістай свабоды магчыма ў выпадках і парадку, устаноўленых законам. Асоба, узятая пад варту, мае права на судовую праверку законнасці яе затрымання або арышту.

Згодна з артыкулам 60 Канстытуцыі кожнаму гарантуецца абарона яго правоў і свабод кампетэнтным, незалежным і непрадузятым судом у вызначаныя законам тэрміны.

Канстытуцыйны Суд адзначае, што прадугледжаны артыкулам 246 КаАП парадак абскарджання мераў адміністрацыйнага ўздзеяння ў вышэйстаячы орган (службовай асобе) або пракурору сам па сабе не супярэчыць абвешчаным у Канстытуцыі гарантыям правоў і свабод чалавека і грамадзяніна: ён закліканы забяспечыць аператыўнае ўстараненне парушэнняў закона, якія дапускаюцца ў правапрымяняльнай практыцы. Аднак устаноўлены ў артыкуле 246 КаАП парадак абскарджання фактычна выключыў магчымасць падачы зацікаўленымі асобамі скаргі ў суд.

Пытанні абскарджання ў суд арышту або працягнення ўтрымання пад вартай у крымінальна-працэсуальным судаводстве былі вырашаны ў Законе ад 3 сакавіка 1994 года, г.зн. да прыняцця Канстытуцыі 1994 года. Што датычыць вядзення па справах аб адміністрацыйных правапарушэннях, то артыкул 246 КаАП не прыведзены ў адпаведнасць з Канстытуцыяй, у сувязі з чым насуперак артыкулу 60 Канстытуцыі рашэнні ўпаўнаважаных дзяржаўных органаў (службовых асоб) па пытаннях прымянення мераў адміністрацыйнага ўздзеяння, устаноўленых у артыкуле 246 КаАП, застаюцца па-за судовым кантролем.

Ацэньваючы довады прадстаўніка Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь аб тым, што палажэнні артыкула 246 КаАП не супярэчаць артыкулу 25 Канстытуцыі, паколькі, па яго меркаванню, указаны артыкул Канстытуцыі вырашае пытанні затрымання толькі як крымінальна-працэсуальнай меры, Канстытуцыйны Суд адзначае, што падобнае тлумачэнне абмяжоўвае сферу дзейнасці артыкула 25 Канстытуцыі і не стасуецца з нормамі міжнароднага права. Пад затрыманай асобай разумеецца любая асоба, пазбаўленая асабістай свабоды не ў выніку асуджэння за ўчыненне правапарушэння (Звод прынцыпаў абароны ўсіх асоб, якія падвяргаюцца затрыманню або зняволенню ў якой бы то ні было форме. Зацверджаны рэзалюцыяй 43/173 Генеральнай Асамблеі ААН ад 9 снежня 1988 года); адміністрацыйнае затрыманне азначае ўзяцце пад варту асобы дзяржавай без прад'яўлення гэтай асобе абвінавачвання ва ўчыненні злачынства і без судовага разгляду затрымання (Правы чалавека і папярэдняе зняволенне. // Зборнік міжнародных стандартаў, якія датычаць папярэдняга зняволення. ААН. Нью-Йорк і Жэнева, 1994).

У артыкуле 246 КаАП апрача абскарджання адміністрацыйнага затрымання рэгулююцца таксама пытанні абскарджання асабістага надгляду, надгляду рэчаў і адабрання рэчаў і дакументаў. Як і затрыманне, указаныя дзеянні могуць быць абскарджаны зацікаўленай асобай у вышэйстаячы орган (службовай асобе) або пракурору.

У адпаведнасці з артыкулам 243 КаАП асабісты надгляд і надгляд рэчаў могуць праводзіцца ўпаўнаважанымі на тое службовымі асобамі адпаведных дзяржаўных органаў. Аб асабістым надглядзе і надглядзе рэчаў складаецца пратакол ці робіцца адпаведны запіс у пратаколе аб адміністрацыйным правапарушэнні або ў пратаколе аб адміністрацыйным затрыманні.

Артыкулам 244 КаАП устаноўлена, што рэчы і дакументы, якія з'яўляюцца сродкам або непасрэдным аб'ектам правапарушэння, выяўленыя пры затрыманні, асабістым надглядзе або надглядзе рэчаў, адбіраюцца службовымі асобамі органаў, прадугледжаных у артыкуле 241 і 243 КаАП. У выпадку адабрання рэчаў і дакументаў аб гэтым складаецца пратакол ці робіцца адпаведны запіс у пратаколах аб адміністрацыйным правапарушэнні, аб надглядзе рэчаў або аб адміністрацыйным затрыманні.

Аналіз зместу прыведзеных артыкулаў КаАП паказвае, што асабісты надгляд і надгляд рэчаў, адабранне рэчаў і дакументаў могуць мець месца як пры адміністрацыйным затрыманні асобы, так і не ў сувязі з затрыманнем. З улікам характару ўказаных мераў Канстытуцыйны Суд лічыць, што пры іх прымяненні таксама могуць быць парушаны ахоўваемыя Канстытуцыяй правы і свабоды грамадзян, перш за ўсё, недатыкальнасць і годнасць асобы (артыкул 25 Канстытуцыі), неўмяшанне ў асабістае жыццё (артыкул 28 Канстытуцыі), недатыкальнасць уласнасці (артыкул 44 Канстытуцыі).

У гэтай сувязі Канстытуцыйны Суд прыходзіць да высновы, што асабісты надгляд і надгляд рэчаў, адабранне рэчаў і дакументаў таксама могуць быць абскарджаны зацікаўленай асобай не толькі ў вышэйстаячы орган (службовай асобе) або пракурору, але і ў адпаведнасці з артыкулам 60 Канстытуцыі — у суд.

Артыкулам 7 Канстытуцыі прадугледжана, што дзяржава, усе яе органы і службовыя асобы дзейнічаюць у межах Канстытуцыі і прынятых у адпаведнасці з ёй актаў заканадаўства.

Згодна з артыкулам 137 Канстытуцыі законы выдаюцца на падставе і ў адпаведнасці з Канстытуцыяй, якая валодае вышэйшай юрыдычнай сілай. У выпадку разыходжання закона з Канстытуцыяй дзейнічае Канстытуцыя.

Артыкулам 142 Канстытуцыі ўстаноўлена, што законы, указы і іншыя акты, што дзейнічалі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь да ўвядзення ў дзеянне Канстытуцыі, прымяняюцца ў частцы, якая не супярэчыць Канстытуцыі.

Канстытуцыйны Суд прыходзіць да высновы, што палажэнні артыкула 246 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях як абмяжоўваючыя права грамадзяніна на доступ да правасуддзя, перашкаджаючыя рэалізацыі права кожнага на гарантаваную Канстытуцыяй абарону яго правоў і свабод незалежным і непрадузятым судом, супярэчаць артыкулам 25, 28, 44 і 60 Канстытуцыі, а таксама Міжнароднаму пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах, ратыфікаванаму Рэспублікай Беларусь.

На падставе выкладзенага і кіруючыся артыкулам 116 Канстытуцыі, артыкуламі 5, 6, 34, 38, 40 і 43 Закона «Аб Канстытуцыйным Судзе Рэспублікі Беларусь», Канстытуцыйны Суд

В Ы Р А Ш Ы Ў:

1. Прызнаць артыкул 246 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях не адпавядаючым Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, Міжнароднаму пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах у той меры, у якой ён не прадугледжвае судовае абскарджанне адміністрацыйнага затрымання, асабістага надгляду, надгляду рэчаў і адабрання рэчаў і дакументаў.

2. Нацыянальнаму сходу Рэспублікі Беларусь унесці ў Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях, другія законы змяненні і дапаўненні, якія забяспечваюць рэалізацыю права грамадзян на абскарджанне ў суд адміністрацыйнага затрымання, асабістага надгляду, надгляду рэчаў, адабрання рэчаў і дакументаў у адпаведнасці з гэтым Заключэннем.

3. Да ўнясення змяненняў і дапаўненняў у Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях і іншыя нарматыўныя акты па пытаннях судовага абскарджання адміністрацыйнага затрымання, асабістага надгляду, надгляду рэчаў, адабрання рэчаў і дакументаў у адпаведнасці з артыкуламі 137 і 142 Канстытуцыі павінна непасрэдна прымяняцца норма артыкула 60 Канстытуцыі.

4. Апублікаваць гэта Заключэнне ў дзесяцідзённы тэрмін з дня прыняцця ў «Народнай газеце» і «Звяздзе», а таксама ў «Ведамасцях Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь».

5. Гэта Заключэнне ўступае ў сілу з дня абвяшчэння, з'яўляецца канчатковым, абскарджанню і апратэставанню не падлягае.

Старшынствуючы — Старшыня Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь Р. А. ВАСІЛЕВІЧ

19 чэрвеня 1998 г., г. Мінск

№ З-66/98

МЫ ГРУНТОЎНА ПРАСУНУЛІСЯ НАПЕРАД...

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

Зыходзячы з інтарэсаў рэспублікі ажыццяўлялася знешнепалітычная дзейнасць. Дэпутаты прымалі актыўны ўдзел у рабоце Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі. Пашыралася і ўдасканальвалася міжпарламенцкая дзейнасць.

Комплекснаму разгляду праблем удасканалення заканадаўства Рэспублікі Беларусь і ролі ў гэтым працэсе парламента была прысвечана навукова-практычная канферэнцыя, якую мы правялі 28—29 мая. На канферэнцыі адбылася дзелавая і зацікаўленая размова па шырокаму колу праблем фарміравання прававой сістэмы нашай дзяржавы, прывядзенню заканадаўства ў адпаведнасць з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, уніфікацыі заканадаўства Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі, фарміраванню адзінага прававога поля Беларусі і Расіі, збліжэнню прававых сістэм у рамках СНД.

Зроблена, як бачым, нямала. І ў гэтай сувязі я хачу выказаць вам, паважаныя дэпутаты, сардэчную ўдзячнасць за вялікую і адказную дзяржаўную працу ў працэсе сесіі.

Аднак нельга не адзначыць і тых недапрацовак, якія не зжыты да цяперашняга часу. Думаецца, Палата прадстаўнікоў не ў поўнай меры выкарыстала свае магчымасці для таго, каб працаваць больш плённа. Гэта, перш за ўсё, датычыцца прыняцця комплекса кодэксаў. Мы планавалі разгледзець і прыняць у другім чытанні праекты Крымінальнага, Крымінальна-працэсуальнага і Крымінальна-выканаўчага кодэксаў Рэспублікі Беларусь, Кодэкса гандлёвага мораплавання. З гэтай задачай мы не справіліся.

5 законапраектаў адхілена Саветам Рэспублікі. Гэта праекты законаў: «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны» (Пастаянная камісія па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічнаму прагрэсу), «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Грамадзянскі працэсуальны кодэкс Рэспублікі Беларусь» (Пастаянная камісія па заканадаўству), «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Крымінальна-працэсуальны кодэкс Рэспублікі Беларусь» (Пастаянная камісія па нацыянальнай бяспецы), «Аб цэнаўтварэнні» і «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях» (Пастаянная камісія па пытаннях эканомікі).

Асабліва хацелася б спыніцца на законапраекце «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь» (па пытаннях мытнага і экспартнага рэгулявання — Пастаянная камісія па міжнародных справах і сувязях з СНД).

Гэты законапраект сапраўды стаў нейкім каменем спатыкнення ў нашай заканадаўчай практыцы. Тройчы праект уносіўся на разгляд, але з-за таго, што не было поўнага разумення гэтай праблемы паміж распрацоўшчыкамі гэтага законапраекта, суб'ектам права заканадаўчай ініцыятывы і пастаяннай камісіяй, гэты законапраект, нягледзячы на тое, што ён абвешчаны Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь тэрміновым, так і застаўся да канца не разгледжаным. Мяркую, што Пастаянная камісія па міжнародных справах і сувязях з СНД павінна з гэтага зрабіць правільны вывад і выправіць гэтае становішча ў першыя ж дні чарговай восеньскай сесіі.

Наперадзе ў нас міжсесійны перыяд, і наша задача максімальна яго выкарыстаць для падрыхтоўкі законапраектаў да наступнага іх разгляду на пятай сесіі, пазбегнуўшы тых недахопаў, якія былі ў нас у рабоце.

Паважаныя дэпутаты!

Перш за ўсё, адразу ж пасля сесіі кожнаму з нас трэба сустрэцца з выбаршчыкамі, выступіць у працоўных калектывах. Нам ёсць аб чым расказаць.

Нягледзячы на занятасць дэпутатаў-вытворцаў, трэба актыўна ўдзельнічаць у рабоце пастаянных камісій. Заканатворчасць — гэта наша галоўная работа.

Мы завяршаем сесію напярэдадні знамянальнай падзеі — Дня Рэспублікі. Хачу ўсіх вас горача і сардэчна павіншаваць з надыходзячым святам, пажадаць усяго самага добрага вам, вашым родным і блізкім.

Ходзяць чуткі, што...

...падаражэюць нафтапрадукты

Нягледзячы на тое, што сусветныя цэны на нафту апошнім часам змяншаюцца (аб гэтым газета ўжо пісала), пагаворваюць, быццам у Беларусі хутка адбудзецца павелічэнне цэн на нафтапрадукты. Пагалоска сцвярджае, што рознічныя цэны на іх узрастуць ажно на 10 працэнтаў і адбудзецца гэта 1 ліпеня.

Як стала вядома карэспандэнту «Звязды» з кампетэнтнай крыніцы, сапраўды, цэны на нафтапрадукты гатовы зрушыць з месца, праўда, пакуль не ўдакладнена дата, з якой яны павялічацца. Інфармаваная крыніца назвала тэрмін «першая палова ліпеня», хаця не выключана і больш канкрэтная гадзіна «ікс» — адразу пасля святаў.

Павелічэнне кошту закране найперш светлыя нафтапрадукты — бензін і дызельнае паліва. Адбудзецца гэта праз рост ставак акцызаў, якія ўстанаўліваюцца для нафтаперапрацоўчых прадпрыемстваў. Плануецца, што стаўкі акцызаў узрастуць на 30 працэнтаў, што, у рэшце рэшт, прывядзе да павелічэння аптовых і рознічных цэн на бензін і дызпаліва ў сярэднім на 5 працэнтаў. Аднак павелічэнне кошту нафтапрадуктаў, як заявіла крыніца, ніколькі не адаб'ецца на камунальных тарыфах. Справа ў тым, што большасць кацельняў для абагрэву выкарыстоўваюць мазут, а на яго ставак акцызаў няма. Каму дакладна неўзабаве трэба будзе плаціць больш, дык гэта аўтаўладальнікам, а пасля і проста пасажырам грамадскага транспарту.

Сяргей РАСОЛЬКА.

СЕМІНАР ДЛЯ РЭДАКТАРАЎ

Завяршыў сваю работу рэспубліканскі семінар рэдактараў абласных, гарадскіх, раённых і аб'яднаных газет, які быў арганізаваны Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку на базе Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

Актуальныя пытанні грамадска-палітычнага жыцця рэспублікі, асноўныя накірункі дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі былі абмеркаваны ўдзельнікамі семінара падчас сустрэчы з намеснікам кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь І. Пашкевічам. На семінары таксама выступілі старшыня Дзяржаўнага камітэта па друку М. Падгайны, міністр сацыяльнай абароны В. Даргель, старшыня Дзяржаўнага камітэта па справах моладзі А. Пазняк, пастаянны паўнамоцны прадстаўнік Рэспублікі Беларусь пры статутных і іншых органах СНД С. Посахаў, адказныя работнікі міністэрстваў і ведамстваў, навукоўцы.

Інфармацыйна-аналітычнае ўпраўленне Дзяржdruку.

І ЗНОЎ УЗЯЛІСЯ ЗА ЯДАХІМІКАТЫ...

Як ужо паведамлялася, пасля серыі крадзяжоў была затрымана група маладых людзей, якія спецыялізаваліся на крадзяжах ядахімікатаў. Гэтая прадукцыя потым, паводле папярэдніх даных, накіроўвалася канкрэтным закупшчыкам у Літву. Здавалася б, на гэтым з крадзяжамі ядахімікатаў пастаўлена кропка. І вось зноў паведамленне: у вёсцы Шкунцікі Шаркаўшчынскага раёна ў ноч на 25 чэрвеня невядомыя, адціснуўшы дзверы, праніклі ў складское памяшканне калгаса імя Ільіча, адкуль укралі ядахімікатаў на суму каля 100 мільёнаў рублёў. Пакуль невядома, куды на гэты раз вядуць сляды выкрадальнікаў.

Васіль НІКАЛАЕЎ.

Міхаіл ДЗЯЛЕЦ:

«ДЛЯ ЧАЛАВЕКА НЯМА БОЛЬШАГА ШЧАСЦЯ, ЧЫМ ПАВАГА ЛЮДЗЕЙ, З ЯКІМІ ДАВЯЛОСЯ ПРАЦАВАЦЬ»

...Здаецца, толькі нядаўна быў рэдактар «Звязды» Міхаіл Дзялец выдаў загад аб маім прызначэнні на пасаду літсупрацоўніка, а потым падпісаў першую камандзіроўку. З таго дня мінула ўжо больш як 26 гадоў. І вось лёс зноў звёў мяне з Міхаілам Іванавічам — на гэты раз, каб узяць інтэрв'ю з нагоды яго 80-гадовага юбілею. Шчаслівае жыццё, багатае на падзеі і людзей, з кім давялося працаваць поплеч. Журналістыка, партыйная, савецкая, прафсаюзная работа, пасля зноў работа ў сродках масавай інфармацыі: рэдактарам, старшынёй Дзяржаўнага камітэта па друку. І як адзнака за працу — 4 ордэны, у тым ліку і ордэн Леніна — вышэйшая па тым часе ўзнагарода. І першае пытанне: як пачаўся шлях у журналістыку?

— Пасля дэмабілізацыі з арміі ў 1946 годзе, - гаворыць Міхаіл Іванавіч, — мяне прынялі загадчыкам карсеткі ў БЕЛТА. Потым вучоба ў партыйнай школе і завочна — у Белдзяржуніверсітэце. Амаль адначасова атрымаў два дыпломы. І ўжо ў 1949 годзе трапіў у баранавіцкую абласную газету на пасаду раз'язнога карэспандэнта. Потым быў загадчыкам аддзела, адказным сакратаром, намеснікам рэдактара. Пэўны час давялося папрацаваць рэдактарам баранавіцкай аб'яднанай газеты. У той час Баранавіцкі гарвыканкам узначальваў Герой Савецкага Саюза Уладзімір Зіноўевіч Царук. Сам па сабе чалавек выдатны. А вось акружэнне яго было не з лепшых. Яны прыкрываліся яго светлым імем і тварылі свае нядобрыя справы. Пайшлі пісьмы ў газету з крытыкай на гарвыканкам. Мы пачалі друкаваць іх. Выклікалі да першага сакратара гаркама. Як можна крытыкаваць кіраўнікоў горада? Я і сказаў яму, што нічога не маю супраць самога Уладзіміра Зіноўевіча, але вакол яго ўтварылася балота. А калі ўжо потым спатрэбіўся чалавек на пасаду старшыні гарвыканкама, тут ужо мне прыпомнілі: паколькі, маўляў, пісаў у газеце, што ў выканкаме балота, ідзі і разграбай яго.

Адным словам, прызначылі старшынёй Баранавіцкага гарвыканкама. А потым былі пасады першых сакратароў райкамаў і гаркамаў партыі, аж пакуль у 1956 годзе не прызначылі старшынёй Брэсцкага абласнога Савета прафсаюзаў.

— А як трапілі ў «Звязду»?

— Выклікалі ў 1969 годзе ў ЦК КПБ. Прыняў мяне асабіста Пётр Міронавіч Машэраў, які тады ўзначальваў партыйную арганізацыю рэспублікі. Я з ім быў знаёмы, калі яшчэ працаваў у Брэсце. Ён і прапанаваў мне стаць рэдактарам «Звязды». Прызнацца, былі сумненні: першая газета рэспублікі, вопытныя майстры пяра, а я — журналіст з перыферыі. Ды і тое — у мінулым. Было ад чаго засумнявацца. Пазваніў у «Звязду» да Янкі Казлова. З ім яшчэ некалі працавалі ў Баранавічах. Ён і ашарашыў:

— Даюць нам новага галоўнага, кажуць, у былым нейкі прафсаюзны лідэр, да таго ж стары ўжо...

Мяне як варам абдало.

А назаўтра — Бюро ЦК КПБ. Маёй думкі наконт гэтага нават не спыталі. Зацвердзілі — і ўсё. Ідзі, кіруй.

— І...

— Я ўжо ведаў, што пры маім папярэдніку калектыў падзяліўся на два лагеры: адны падтрымлівалі рэдактара, другія былі супраць. І гэта непрыязнасць захавалася. Мне прапаноўвалі наогул сяго-таго звольніць. Я ж вырашыў памірыць іх. Спецыяльна арганізаваў выезды ў Белавежскую пушчу, потым — у Брэст. У нефармальнай абстаноўцы лягчэй знайсці агульную мову. Словам, удалося захаваць калектыў. А якія гэта былі журналісты! Мікалай Філімонаў, Васіль Нікалаенка, Рыгор Сяргеенка, Раіса Самусенкава, Янка Казлоў... Шкада, што многіх з іх ужо няма ў жывых.

Пачаў заглыбляцца ў справы. З сумам даведаўся, што тыраж «Звязды» мізэрны — усяго 69 тысяч экзэмпляраў. Вырашыў мяняць твар газеты, рабіць яе больш прывабнай, даходлівай. Пачалі пісаць нарысы пра лепшых людзей рэспублікі, змяшчаць іх партрэты, выкананыя лепшымі мастакамі, друкаваць падборкі пісьмаў з месцаў, навіны. Запрасілі да супрацоўніцтва найбольш вядомых паэтаў і празаікаў. Па дамоўленасці з Андрэем Макаёнкам «Звязда» першай з рэспубліканскіх выданняў друкавала яго новыя п'есы. Ахвотна змяшчалі свае творы на старонках «Звязды» Іван Шамякін і Іван Мележ, Пятрусь Броўка... Пакрысе справы пачалі выпраўляцца, газета стала больш цікавай, вырас яе тыраж. Звярнуўся па дапамогу і да Пятра Міронавіча Машэрава, каб ЦК паўздзейнічаў на райкамы партыі, большасць з якіх наогул не выпісвалі «Звязду». Ва ўсякім разе, неўзабаве тыраж давялі да 110 тысяч экзэмпляраў. Хацелася працаваць яшчэ лепш, але тут новы паварот: мяне прызначылі старшынёй Дзяржкамітэта па друку. Там адпрацаваў ажно 17 гадоў. Агульнымі намаганнямі мы паставілі айчынную паліграфію на ўзровень самых найноўшых патрабаванняў. З гордасцю магу зазначыць, што агульны аб'ём продажу кніг на Сусветным Маскоўскім кірмашы перавышаў тады продаж выданняў з былых саюзных рэспублік разам узятых, за выключэннем Расіі. А колькі часу, сіл і здароўя было патрачана на будаўніцтва фабрыкі каляровага друку — па тым часе адной з лепшых у Саюзе.

— Ведаю, што Вас будуць віншаваць з юбілеем сотні людзей, зычыць здароўя, плёну ў творчасці. А што б Вы пажадалі ім?

— Шчасця і дабрабыту. І наогул няма большага шчасця, чым павага людзей, з якімі давялося працаваць. А маёй роднай «Звяздзе» — заўсёды быць першай газетай рэспублікі. Больш і лепш пісаць пра людзей, герояў працоўных будняў, бо добрае слова хутчэй знаходзіць дарогу да сэрца. А яшчэ не шкадаваць месца для іх пісьмаў. Словам, быць творцамі!

Гутарыў Уладзімір ГОЙТАН.
Фота Мікалая АМЕЛЬЧАНКІ.

БОЛЬШ 80 ПАДПІСЧЫКАЎ «ЗВЯЗДЫ» СТАЛІ ЎЛАДАЛЬНІКАМІ ПРЫЗОЎ ГАЗЕТЫ. ВІНШУЕМ! ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ!

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

Для сённяшняга розыгрышу прызы прадаставілі Жодзінскае адкрытае таварыства «Світанак», Мінскі прыборабудаўнічы завод («Белвар»), ААТ «Брэстгазаапарат», Лідскі завод электравырабаў і Магілёўскі ліфтабудаўнічы завод.

Парачка парсючкоў для дарошчвання

Рак Ніна Уладзіміраўна, Клецкі раён, в. Зубкі.

Фірменная майка з эмблемай «Звязды»

Гурскі Міхаіл Максімавіч, г. Масты; **Нічыпар** Мікалай Канстанцінавіч, г. Слуцк; **Котусева** Валянціна Іванаўна, г. Масты; **Корзун** Эдуард Сямёнавіч, в. Гальшаны Ашмянскага раёна; **Каладзінскі** Васіль Макаравіч, г. Гродна; **Туранок** Жанна Генадзьеўна, г. п. Шаркоўшчына; **Гіро** Генадзь Пятровіч, г. Беразіно; **Ярмоліч** Міхаіл Рыгоравіч, Столінскі р-н, в. Альшаны; **Булойчык** Мікалай Фёдаравіч, Маладзечанскі р-н, пас. Бярэзінскае; **Мінзер** Мікалай Лявонцьевіч, Драгічынскі р-н, в. Заверш'е; **Маркава** Вольга Аляксандраўна, г. Мінск; **Габрыяловіч** Крысціна Альфрэдаўна, Ашмянскі р-н, п/а Гродзі; **Каваленя** Аляксандр Рыгоравіч, Салігорскі р-н, п/а Осава; **Ракса** Марыя Уладзіміраўна, Іўеўскі р-н, в. Ліпнішкі.

Электрадрыль

Марчанка Пятро Міхайлавіч, г. Магілёў.

Прыбор для завіўкі валасоў «Надзейка»

Каменская Таццяна Іванаўна, г. Бабруйск; **Барайшук** Валянціна Ільінічна, Лагойскі р-н, в. Камяно.

Электрамясарубка

Шэўчык Харытон Фёдаравіч, г. п. Мікашэвічы.

Электрапрас «Камфорт»

Гадун Віталь Аляксандравіч, Нясвіжскі р-н, п/а Аношкі; **Лушчык** Аляксей Васільевіч, г. п. Бераставіца; **Чыпурка** Зінаіда Васільеўна, Слуцкі р-н, в. Селішча; **Дуброўская** Марыя Гаўрылаўна, г. Жлобін.

Глюкаметр

Семуроў Фёдар Емяльянавіч, Глыбоцкі р-н, в. Падсвілле.

Кухонная электрамеханічная машына

Гуткоўская Ганна Валянцінаўна, Пухавіцкі р-н, в. Пухавічы.

Пліта СВЧ бытавая «Тытан»

Аляксееў Леанід Міхайлавіч, Гарадоцкі р-н, а/с Маскаленята.

Пліта бытавая газавая

Лягеза Аляксандр Вікенцьевіч, Мастоўскі р-н, п/а Курылавічы.

Пліта газавая турысцкая

Анкуда Ядвіга Зянонаўна, Лагойскі р-н, в. Скароды; **Панцялеева** Ніна Фёдараўна, г. Светлагорск.

Люстра

Ліцкевіч Ганна Аляксееўна, Пружанскі р-н, в. Стараволя; **Суворава** Ларыса Міхайлаўна, г. Віцебск; **Глінскі** Міхаіл, Смаргонскі р-н, в. Вялікая Мыса; **Шчэрба** Аляксандр Іванавіч, г. Мінск; **Навумавец** Ганна Пятроўна, Драгічынскі р-н, в. Гутава; **Жураўская** Вольга Мікітаўна, г. Гродна; **Скідан** Міхаіл Сяргеевіч, Лагойскі р-н, п/а Кастрычнік.

Электрападвесы

Русак Валянціна Аляксандраўна, Мастоўскі р-н, в. Мялевічы; **Салодкі** Іван Пятровіч, Ляхавіцкі р-н, в. Ліпск; **Лагуцік** Анатоль Анатольевіч, Слонімскі р-н; **Багамазава** Зінаіда Сяргееўна, г. Асіповічы; **Падлінская** Тамара Іванаўна, Слуцкі р-н, в. Сярагі; **Карповіч** Таццяна Анатольеўна, Любанскі р-н, п/а Атраднае.

Бра

Савейка Аляксандр Аляксандравіч, г. Шаркоўшчына; **Чарняўская** Таіса Іванаўна, Дзятлаўскі р-н, в. Круцілавічы; **Карака** Ніна Адамаўна, г. Рэчыца; **Саўко** Валерый Мітрафанавіч, г. Мінск; **Дылеўская** Ніна Аляксандраўна, Маладзечанскі р-н, п/а Крыніца.

Настольная лямпа

Мрочак Генадзь Адамавіч, г. Мінск; **Кеўлюк** І., Зельвенскі р-н, в. Князева; **Шэлег** Тамара Мікалаеўна, Слуцкі р-н, в. Вясея; **Бажко** Галіна Вікенцьеўна, Мядзельскі р-н, в. Сідаравічы; **Якавенка** Анастасія Сцяпанаўна, г. Віцебск; **Карачун** Уладзімір Канстанцінавіч, Капыльскі р-н, в. Вялешына 1.

Лямпы-прышчэпкі

Скаварада Галіна Сяргееўна, Клецкі р-н, п/а Зубкі; **Кандыба** Ганна Міхайлаўна, Шчучынскі р-н, в. Ліпічанка; **Храпавіцкая** Таццяна Кліменцьеўна, г. п. Лагойск; **Шкель** Міхаіл Паўлавіч, Лагойскі р-н, в. Венера; **Новік** Зоя Дзмітрыеўна, г. Віцебск; **Шарох** Мікалай Мікалаевіч, Дзяржынскі р-н, в. Станькава; **Ніцко** Іван, Клічаўскі р-н, в. Чарава; **Лескавец** Леанід Іванавіч, г. Беразіно; **Лосева** Ніна Іванаўна, Вілейскі р-н, в. Іжа; **Драгун** Уладзімір Пятровіч, г. Вілейка; **Самак** Ірына Мікалаеўна, г. Бабруйск; **Яроцкі** Пётр Іванавіч, Бярэзінскі р-н, в. Капланцы; **Бараноўскі** Мікалай Васільевіч, Салігорскі р-н, в. Радкава; **Генец** Яніна Феліцыянаўна, Лідскі р-н, в. Даржы; **Васілеўская** Ганна Іосіфаўна, Капыльскі р-н, в. Блеўчыцы.

Набор для ваннага пакоя

Алёхна Даната Аляксееўна, Браслаўскі р-н, в. Багіно; **Кірыльчык** Лілія Ягораўна, Пастаўскі р-н, в. Камаі; **Грыцкевіч** Валянціна Іванаўна, г. Ляхавічы; **Камейша** Баляслаў Іосіфавіч, г. Брэст.

Падпіска на 4 квартал 1998 года на газету «Звязда»

Банькоўскі Пётр Іванавіч, Полацкі р-н, в. Астроўшчына; **Старавойтава** Інэса Рыгораўна, г. Кіраўск; **Дайнека** Іван Рыгоравіч, Акцябрскі р-н, в. Булкаў; **Генец** Марыя Сяргееўна, г. Навагрудак; **Куцкевіч** Лідзія Пятроўна, Мядзельскі р-н, в. Нарач; **Лобан** Аляксандр Пятровіч, Жыткавіцкі р-н, в. Верасніца; **Бабіч** Сяргей Дзям'янавіч, Глускі р-н, в. Старое Сяло; **Кухта** Мікалай Васільевіч, Барысаўскі р-н, в. Зембін; **Козел** Зоя Канстанцінаўна, Лідскі р-н, в. Драздова; **Семянцова** Яўгенія Іванаўна, г. Рагачоў; **Няміра** Людміла Васільеўна, Лепельскі р-н, в. Н. Валосавічы; **Зянько** Міхаіл Васільевіч, г. Валожын; **Арочка** Наталля Аляксандраўна, Слонімскі р-н, в. Дранава; **Анішчык** Алена Паўлаўна, Клецкі р-н, в. Грыцэвічы.

Віншуем пераможцаў! Тых жа, хто не выйграў, прасілі б не страчваць надзею, спадзявання. З гэтым, здаецца, і жыць лягчэй. Заставайцеся з намі! Выпісвайце і чытайце «Звязду»! Новыя розыгрышы прызоў будуць чакаць вас!

Уладзімір АНДРЫЕВІЧ.

XVI чэмпіянат свету па футболу

IX ЗАСТАЛОСЯ ТОЛЬКІ ВОСЕМ

Учора позна ўвечары ў матчы Аргенціна—Англія, які праходзіў у Сен-Эцьене, вызначыўся апошні з васьмі чвэрцьфіналістаў, якія працягнуць барацьбу за Кубак свету. Крыху раней адбылася гульня Румынія—Харватыя.

Пераможцы гэтых пар сустрэнуцца на наступным этапе з камандамі Галандыі і Германіі адпаведна. Вось пары каманд 1/4 фіналу, якія ўжо вызначыліся: Італія—Францыя, Бразілія—Данія (гульні пройдуць 3 ліпеня). Наступныя дзве сустрэчы адбудуцца 4 ліпеня.

Яшчэ задоўга да адказнага матча з аргенцінцамі галоўны трэнер зборнай Англіі Глен Ходл аб'явіў, што яго падначаленая хочуць звесці рахункі з землякамі Марадоны за чвэрцьфінальны матч Англія—Аргенціна сусветнага першынства 1986 года, калі Дыега Марадона забіў «гол рукой».

«Да гэтай пары ў мяне з'яўляецца сухасць у роце пры ўспаміне аб тым прайграным ў Мексіцы (1:2) матчы, — заявіў Ходл. — Мне не падабаецца слова «помста», але ўсім добра вядома, што адбылося ў 1986 годзе, і ў нас ёсць зараз магчымасць паквітацца. Гэта будзе сапраўдная бітва, і мы гатовы да яе».

Не выклікала буры гневу на вуліцах Бялграда паражэнне зборнай Югаславіі ад галандцаў, бо на міжнародных таталізатарах югаславам адводзілася 10-е месца, г. зн. за рысай патэнцыяльных чвэрцьфіналістаў.

Спадзяюцца на выхад у паўфінал гаспадары турніру. Прэм'ер-міністр Францыі Ліанель Жаспен адзначыў, што «ў зборнай Італіі выйграць можна», і ён абавязкова будзе прысутнічаць на гэтым матчы.

А тым часам мэр Парыжа Жан Ціберы выказаў падзяку галоўным лінейным арбітрам за высокую якасць работы на фінальным турніры.

На прыёме, арганізаваным для суддзейскага корпуса, Ціберы сказаў: «Ваша бліскучая работа садзейнічала поспеху правядзення чэмпіянату свету». Памятным медалём Парыжа былі ўзнагароджаны пяць арбітраў — француз Жаэль Кінью, шатландзец Георг Кумінг, швейцарац Роберт Райа, немец Фолькер Рот і швед Ларс Оке Б'ёрк.

Уладзімір ЗДАНОВІЧ.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

СЛУЖБОВА-КРЫМІНАЛЬНЫ «РАМАН»

«Пісаць яго пачалі некаторыя гродзенскія мытнікі, а «рэцэнзію» выдаў суд

Днямі адразу сем спецыялістаў Гродзенскай рэгіянальнай мытні ды яшчэ адзін камерсант атрымалі ад суда свой тэрмін. Зрэшты, адметнасць гэтай крымінальнай справы не толькі ў колькасці асуджаных і маштабах злачынстваў, для доказу якіх следству спатрэбіўся цэлы год, а суду — 34 старонкі прыгавору. Бадай, упершыню ў судовай практыцы на Гродзеншчыне пакараны і хабарнікі, і тыя, хто дзякуючы хабару «ўмеў жыць». Вось толькі некаторыя фрагменты з гэтага службова-крымінальнага «рамана».

Ратуйце, «баксы», ад раптоўнай праверкі і пераводу на іншае месца работы!

У снежні 1995 года старшы інспектар аддзела № 4 мытні Уладзімір Юшкевіч сабраў па 200 долараў з трох сваіх калег, на такую ж суму раскашэліўся сам і перадаў грошы галоўнаму інспектару гэтага ж падраздзялення Аляксандру Казлоўскаму. Той далажыў сваю сотню (таксама «зялёную») і панёс 900 долараў «наверх» — начальніку аддзела інспекцыі па асабоваму саставу Уладзіміру Патапаву. На той момант Патапаў ужо атрымаў ад Юшкевіча спіс кадраў, якія гатовы «даць». Дамовіліся і наконт штомесячнай таксы: з інспектара — 100 долараў, а з галоўнага інспектара — 50. Казлоўскі, такім чынам, разлічыўся адразу за два месяцы.

Аднак Патапаў, відаць, больш давяраў галоўнаму інспектару Аляксандру Чаўко. І той не падкачаў. З першага ж месяца працоўнай дзейнасці ў аддзеле № 4 Аляксандр Сцяпанавіч і сам плаціў акуратна, і з іншых збіраў для Патапава. У выніку матэрыяльнае становішча апошняга за чатыры месяцы палепшылася яшчэ на 1950 долараў. За гэта хабарадавальнікі разлічвалі, і не без падстаў, на рэжым найбольшага спрыяння з боку інспекцыі па асабоваму саставу. Прасцей кажучы, каб да іх менш чапляліся і не псавалі жыццё нечаканымі праверкамі. І яшчэ каб не здарылася такая бяда, як перавод на іншы ўчастак работы. Бо працаваць на чыгуначным вакзале лічылася вельмі прэстыжна. Папершае, цэнтр горада, утульнае памяшканне, не капае з неба. А падругое, хаця і няшмат цягнікоў, але ёсць вагоны, дзе грузу — пад самы дах. І памер пошліны залежыць, вядома, не толькі ад прафесійнага майстэрства, але і ад сумлення мытніка. Для пэўнага кантынгента, калі па яго слядах не ідзе праверка, гэта сапраўднае залатое дно. Было што губляць. Інакш навошта баяцца кантролю? Ды і грошы на хабар адкуль, няўжо ад продажу бульбы з прысядзібнага ўчастка ля катэджа?

Дарэчы, пра спецыфічныя ўзаемаадносіны Патапава з групай спецыялістаў аддзела № 4 (болей плаціў, напэўна, той, у каго і служба больш даходная) даведаўся Генадзь Марчук. Яго пасада была таксама звязана з барацьбой за чысціню асабовага саставу. І нічога дзіўнага, што Марчук адразу ж учыніў у аддзеле праверку наконт правільнасці спагнання мытнай пошліны з пасажыраў. На гэтым яго прынцыповасць і закончылася. Галоўныя і проста інспектары ўзялі на «ўтрыманне» і Генадзя Іосіфавіча. Штомесячна ён «каштаваў» 30 долараў, праўда, не грашыма, а спіртнымі напоямі і прадуктамі харчавання. І так доўжылася амаль год. За гэты перыяд ніхто з хабарадавальнікаў не быў пакараны пераводам у іншы аддзел.

Залаты ланцужок і сушаная рыба для ўплывовых людзей

На мытні ёсць пакой, дзе захоўваецца зброя. І вось аднойчы работнік гэтага пакоя Сатыраў (сапраўднае прозвішча не называем, паколькі чалавек прыйшоў з пакаяннем і вызвалены ад крымінальнай адказнасці) сур'ёзна парушыў службовую інструкцыю. Ён быццам бы заснуў на рабочым месцы і не выдаў зброі мытнікам, якія выязджалі ў размешчаныя за горадам пункты. Зразумела, што Сатырава адразу выклікалі ў інспекцыю па асабоваму саставу. Генадзь Марчук узяў з парушальніка пісьмовае тлумачэнне і заяву аб звальненні па ўласнаму жаданню. Але дата на апошнім дакуменце не стаяла і ход ёй дадзены не быў. Скандал завяршыўся для Сатырава калі не лёгкім спалохам, дык і не надта ўжо трагічна — строгай вымовай. Ну як не аддзякаваць? Да таго ж у Марчука засталася вышэйпамянёная заява. А яшчэ Сатыраву вельмі хацелася перайсці са зброевага пакоя на іншую, больш прэстыжную работу. І пачалося: 20 долараў «у доўг» Марчуку быццам бы на яго камандзіроўку, 150 — на пакупку машыны (апошнюю суму ўжо пасля затрымання Генадзя Іосіфавіча вярнула жонка), пляшка гарэлкі на майскія святы і, вядома, у Дзень мытніка...

А спадар Казанюк (сапраўднае прозвішча таксама іншае, бо і ён пакаяўся) акрамя гарэлкі насіў Марчуку піва і сушаную рыбу. Начальнік аднаго з мытных падраздзяленняў не хацеў, каб да яго накіроўвалі дрэнных работнікаў. І тут, аказваецца, трэба шукаць падыход да ўплывовага чалавека. Яшчэ два спецыялісты і хацелі б разлічыцца рыбай, ды не той выпадак. Яны афармілі тры фіктыўныя мытныя дэкларацыі на машыны, і пра гэта даведалася інспекцыя па асабоваму саставу. Звальненне з працы? Перадача матэрыялаў у следчыя органы для ўзбуджэння крымінальнай справы? Не, аб'явілі вымову. І яшчэ дэпрэміравалі. Цікавая дэталь: мытнікі пазбавіліся таго, чаго ўжо... не мелі ў выніку ранейшых спагнанняў. Само сабой, такое «пакаранне» даецца не за дзякуй. Марчуку падарылі залаты ланцужок, наручны гадзіннік з бранзалетам замежнай вытворчасці і таксама імпартны кейс.

Неблагі «сувенір» дастаўся і Патапаву. Адзін мытнік быў не ў водпуску, а значыць, паездка за мяжу магчыма толькі ў выключным выпадку. Уладзімір Аляксандравіч дазволіў і пры гэтым зрабіў заяўку на карбюратар да аўтамабіля «ВАЗ». Мытнік прывёз яго з Польшчы. Патапаў не заплаціў.

Прадпрымальнікі па сумяшчальніцтву

Мытны інспектар Ігар Бубейка ў вольны ад непасрэдных абавязкаў час заняўся аўтабізнесам. Пра гэта даведаўся спадар Патапаў і замест таго, каб паставіць на месца члена асабовага саставу мытні, сам падключыўся да камерцыі. Ён мог паскорыць мытнае афармленне аўтамашын, набытых за мяжой. А гэта — хутчэйшы абарот укладзенага капіталу, большы прыбытак. Асабіста Бубейка перадаў 5 машын і яшчэ 6 — разам з Патапавым.

Даход толькі ад сумеснай прадпрымальніцкай дзейнасці склаў 27 тысяч 300 долараў.

Акрамя таго, гэтая «парачка» паклапацілася пра фіктыўныя мытныя дакументы на 8 аўтамабіляў. У выніку «колы», якія прыбылі на адрас фірмы (растаможка тут па максімуму), афармілі на прыватных асоб. Яны за ўзнагароджанне прадставілі фірме свае дакументы. На гэтым іх місія была вычарпана, машынамі распараджаліся іншыя.

Замест эпілога

Вынікам следства, якое пачалі супрацоўнікі УКДБ па Гродзенскай вобласці, а прадоўжылі разам з імі работнікі пракуратуры, стаў прыгавор суда Кастрычніцкага раёна г. Гродна. Шэсць чалавек асуджаны да розных тэрмінаў, дваіх пакаралі так званай «хіміяй». Расследаванне шэрагу службова-крымінальных эпізодаў працягваецца асобна.

Чатыры супрацоўнікі мытні прыйшлі з пакаяннем. А вось адваротны факт. Міліцыя затрымлівае мікрааўтобус з таварам. На кантрольным талоне — асабістая нумарная пячатка мытніка Брузгіна. Пачалі разбірацца — «памылка» пры вызначэнні пошліны склала 279 мільёнаў рублёў з гакам у бок змяншэння. І гэта ў той час, калі поўным ходам ідзе следства, высвятляецца роля Аляксея Брузгіна ў дачы хабару і падробцы дэкларацый. Ці патрэбны тут нейкія каментарыі?

І яшчэ адзін урок аферыстам. Даў, узяў, але за руку не схоплены і таму я «на кані»? Гэтая крымінальная справа паказвае, што здараецца і інакш.

Што датычыцца былога кіраўніка мытні спадара Ледаўскіх, дык да яго ў праваахоўных органаў пытанні былі, аднак ён звольніўся і цяпер, кажуць, абараняе мытныя інтарэсы Расіі. А сённяшняе кіраўніцтва Гродзенскай рэгіянальнай мытні, па словах супрацоўнікаў дзяржбяспекі, «пытанні не адмятае, рэакцыя адчуваецца. Як будзе далей — пакажа час».

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Культурныя сувязі

ТВОРЫ СА СКАРБНІЦ КІТАЙСКАЙ КАЛЕКЦЫІ

Амаль адразу за выстаўкай афортаў славутага іспанскага мастака Гоі ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі адкрылася экспазіцыя твораў кітайскіх майстроў.

Мастацтва Старажытнага Усходу, асабліва кітайскіх майстроў, якія жылі да нашай эры, у пачатку мінулага тысячагоддзя і пазней, заўсёды зачароўвала еўрапейцаў нязвыклым светапоглядам, своеасаблівым бачаннем прыгажосці, вытанчанай тэхнікай выканання. Таму выстава з Тайбэйскага Нацыянальнага дварцовага музея выклікала зразумелую цікавасць у мінчан.

Думаецца, вельмі правільна зрабілі арганізатары выстаўкі, што да яе адкрыцця прымеркавалі лекцыю і камп'ютэрную дэманстрацыю скарбаў кітайскага мастацтва, якую правялі старшы навуковы супрацоўнік Нацыянальнага музея, вядомы эксперт па мастацтву Усходу Алена Сінкевіч. Яна паведаміла шмат цікавага і карыснага. Напрыклад, пра багатую калекцыю твораў дэкаратыўна-прыкладнога з музея з тайваньскага горада Тайбэй. Фонды гэтага музея велізарныя (каля 600 тысяч твораў) і шырока вядомыя ў свеце прыхільнікам кітайскага мастацтва. Асновай гэтага багацця стала славутая імператарская калекцыя, якую правіцелі Кітая збіралі не адно стагоддзе.

Ініцыятарам выстаўкі ў Мінску стаў фонд Тай Мін — міжнародны фонд экалагічнага і культурнага супрацоўніцтва паміж сталіцай Беларусі і Тайбэем.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

СПАЖЫВЕЦ

Скварка з лімонам працягне беларусу жыццё?

Назіраемы ў апошнія гады ў нашай краіне рост сардэчна-сасудзістых, анкалагічных і іншых неінфекцыйных захворванняў многія з спецыялістаў напрамую звязваюць з прыродай харчавання беларусаў: з якасцю і харчовай каштоўнасцю прадуктаў, якія мы штодзень ужываем.

Трэба растлумачыць, што харчовую каштоўнасць прадукту вызначаюць не толькі бялкі, тлушчы і вугляводы, але ў не меншай ступені і вітаміны, і мікраэлементы, дэфіцыт якіх у арганізме прыводзіць да авітамінозу.

Так ужо склалася, што пры адсутнасці адзінай дзяржаўнай праграмы вітамінізацыі прадуктаў харчавання і вітаміннай недастатковасці наша насельніцтва «вітамінізуе» сябе само, накіроўваючыся кожную вясну на дачныя соткі. Аб эфектыўнасці такой барацьбы з вітамінным дэфіцытам — наша гаворка з галоўным спецыялістам Міністэрства аховы здароўя па праблемах харчавання, доктарам медыцынскіх навук, прафесарам Валерыем МУРАХАМ...

— Валерый Іванавіч, па колькасці ўжывання вітамінаў як выглядае Беларусь на фоне іншых развітых краін свету?

— Мы выглядаем не проста дрэнна, а вельмі дрэнна. Сёння на стале ў беларуса прысутнічаюць толькі чатыры віды агародніны: бульба, буракі, морква і капуста, гэта значыць тая прадукцыя, якую ўсе мы вырошчваем на прысядзібных участках. Згодна з нашымі разлікамі, сярэдні жыхар Беларусі атрымлівае вугляводаў звыш нормы ў 2,5 раза, і ўсё гэта на фоне нізкага забеспячэння агароднінай і садавінай.

— Няўжо выпраўленню становішча не спрыяе бойкі гандаль заморскай садавінай і агароднінай, які з кожным днём набірае абароты, і ці ў стане яны папоўніць запас вітамінаў, такіх неабходных беларусам?

— Пытанне трэба ставіць крыху інакш. Папоўніць запас вітамінаў заморская садавіна, зразумела, можа, але хто можа яе купіць? Паўднёвую садавіну ўжываюць толькі 1 працэнт насельніцтва краіны, прычым пераважна гарадскія яе жыхары. Горад — гэта ўвогуле адна вялікая харчовая звалка, і ён ні ў якім разе не адлюстроўвае фактычнага стану харчавання ўсіх беларусаў. Ацэньваць можна толькі па сельскаму насельніцтву, якое харчуецца ўласнаручна вырошчваемымі прадуктамі. А што і ў якой колькасці мы вырошчваем, усім добра вядома.

Сітуацыя ўвогуле даходзіць да абсурду. У магазінах круглы год прадаюцца польскія, французскія яблыкі, затое беларускіх яблыкаў там знайсці немагчыма. І мы вымушаны плаціць за іх грошы, роўныя кошту аднаго кілаграма мяса. Ці многія на гэта здольныя? У той жа час кожнаму беларусу трэба з'ядаць у дзень хаця б па аднаму яблыку, які з'яўляецца цудоўным сродкам прафілактыкі анкалагічных захворванняў. Праблему вострай жалезадэфіцытнай анеміі, ад якой церпяць большасць беларускіх жанчын, дзяцей і падлеткаў, таксама можна вырашыць штодзённым ужываннем звычайных беларускіх яблыкаў, толькі ў гэтым выпадку трэба мець на ўвазе, што жалеза ў вялікай колькасці ўтрымліваюць толькі несалодкія іх сарты, напрыклад, наша антонаўка.

— А ці ёсць сэнс вырошчваць на беларускай глебе паўднёвыя культуры?

— Справа ў тым, што каштоўнасць садавіны і агародніны залежыць як ад культуры земляробства, так і ад колькасці атрымліваемай імі сонечнай энергіі. А гэта значыць, што цеплалюбівыя расліны, вырошчваемыя ў Беларусі, ніколі міжнародным параметрам адпавядаць не будуць. Яны ўвогуле некарысныя, бо, з аднаго боку, патрабуюць вялікіх затрат працы, а з другога — велізарнай хімізацыі сельскай гаспадаркі. Менавіта таму ў парніковых раслін нормы ўтрымання нітратаў у 3-4 разы вышэй, чым у звычайных.

— Няўжо вы жадаеце сказаць, што агуркі і таматы, якія трапляюць нам на стол вясною прама з цяпліц, не валодаюць аніякай каштоўнасцю?

— Гэта так, нічога акрамя смакавага моманту (ні вітамінаў, ні мікраэлементаў), у такой прадукцыі няма. Таму ставіцца да яе як да далікатэсу не варта. Яна можа паслужыць добрым упрыгажэннем стала, і толькі... А ўлічваючы павышанае ўтрыманне ў такой штучна вырашчанай зеляніне нітратаў, яе нельга даваць дзецям, асабліва маленькім.

— Валерый Іванавіч, ужо каторы год запар ходзяць настойлівыя чуткі, што хімікаты, пры дапамозе якіх апрацоўваюцца імпартныя плады, могуць уяўляць небяспеку для здароўя...

— Як у імпартнай садавіне падтрымліваецца на працяглым шляху з поўдня да нас жыццяздольнасць — гэта асабістая тайна кожнага экспарцёра. Але я магу запэўніць вас, што ніякай небяспекі ў садавіне і агародніне, дапушчанай санітарнымі службамі ў гандаль, быць не можа. Магу параіць толькі перад ужываннем ачышчаць зеляніну, бо звычайна, калі пры яе вырошчванні выкарыстоўваліся ядахімікаты, нітраты ці азот, усе яны канцэнтруюцца менавіта ў лупіне.

— Ва ўсе часы, Валерый Іванавіч, хатнія гаспадыні ў нашай краіне займаліся і працягваюць займацца кансерваваннем. Да таго ж у апошнія гады ўсе захапіліся яшчэ і замарожваннем у сучасных халадзільніках агародніны і садавіны, прызначанай для папаўнення вітамінных запасаў зімой. Можа хоць такім чынам у самы «невітамінны» час года можна змагацца з вітаміннай недастатковасцю?

— У кансерваванай агародніне і садавіне нічога не захоўваецца, акрамя смаку. Да таго ж такія нарыхтоўкі нярэдка шкодзяць нашаму арганізму. Напрыклад, варэнне, якое мы ўсе так любім, гэта ж чысты цукар, пустыя калорыі. Вы ўявіце сабе, што сярэдні беларус з'ядае ў дзень да 500 грамаў бульбы — гэта значыць сутачны запас цукру, потым налівае сабе яшчэ шклянку чаю з цукрам і кладзе на батон варэнне! Ну якая падстраўнікавая залоза можа вытрымаць такі здзек? Таксама не варта ўжываць і расол з-пад агуркоў і таматаў, бо пры кансерваванні, калі ў зеляніне ўтрымліваліся нітраты, солі азотнай кіслаты лёгка пераходзяць у вадкасць.

Што ж датычыцца каштоўнасці замарожаных садавіны і агародніны, то я вам скажу наступнае: зараз у свеце ўжо распрацаваны сучасныя тэхналогіі і маразільныя камеры, якія дазваляюць захаваць пры замарожванні садавіны, агародніны і ягад усе іх каштоўныя якасці. Аднак і размарожвацца такая прадукцыя павінна таксама па пэўных тэхналогіях. У хатніх умовах і ў нашых халадзільніках гэта недасягальна.

— Валерый Іванавіч, і ўсё ж, зыходзячы з фінансавых магчымасцяў сярэдняга беларуса, можна меркаваць, што разнастайным яго вітамінны асартымент стане няхутка. У сувязі з гэтым ці не маглі б вы засяродзіць увагу нашых чытачоў на самай незаменнай садавіне ці агародніне...

— Я лічу, што якая б ні была бедная сям'я, але на яе стале ў абавязковым парадку павінны прысутнічаць лімоны. Гэта тлумачыцца тым, што ў Беларусі традыцыйна ядуць шмат смажанай і вэнджанай ежы, якая ўтрымлівае ў вялікай колькасці канцэрагены. У чыстым выглядзе ўжываць канцэрагены непажадана, лепш з'есці ўпрыкуску з лімонам.

Дарэчы, ва ўсіх цывілізаваных краінах свету да стала заўсёды падаюць лімоны, стравы паліваюць лімонным сокам. Напрыкад, шпроты без лімонаў увогуле нельга есці (гэта ж жывыя канцэрагены!), а таксама не рэкамендуецца даваць іх дзецям. Лімон, дзякуючы наяўнасці ў ім аскарбінавай кіслаты, — гэта мацнейшы проціракавы прафілактычны сродак. Амерыканскія вучоныя даказалі, што прыём аскарбінавай кіслаты па 1,5 грама ў суткі дазваляе знізіць рызыку захворвання на рак страўніка ў 4—5 разоў.

— Але лімоны любяць не ўсе. Можа магчыма замяніць іх апельсінамі?

— Апельсіны замяніць лімоны не могуць. І ўвогуле да іх трэба ставіцца даволі асцярожна, паколькі апельсіны ўтрымліваюць у сабе ксанціны — рэчывы, якія могуць даць непажаданы эфект, напрыклад, алергічныя праяўленні. Асабліва шмат ксанцінаў утрымліваецца ў бананах, ужыванне якіх у вялікай колькасці, асабліва дзецьмі, можа аказацца небяспечным.

Гутарку вяла Надзея НІКАЛАЕВА.

Інфарм-кактэйль

Паліцэйскія ўлады Бразіліі яшчэ ў маі мінулага года аб'явілі аб устаноўцы спецыяльнага тэлефоннага нумара, па якому ў любую гадзіну сутак можна паведамляць аб сексуальным насіллі над дзецьмі і падлеткамі. З таго часу толькі ў Рыо-дэ-Жанейра прынята 1807 падобнага роду паведамленняў. Часцей за ўсё ў злачынствах выкрываюцца замежныя турысты. Усяго ж раскрытымі, як лічыцца, аказваецца толькі дзесятая частка сексуальных злачынстваў. Вядомы і факт, што ў Бразіліі штогод становяцца цяжарнымі каля аднаго мільёна 10—14-гадовых дзяўчынак.

ІТАР—ТАСС.

Родная мова — лепшая. Гэта гучыць як аксіёма. Натуральна, што дзеці павінны навучацца на ёй. І менавіта так вырашылі ўлады дзяржавы, якая называецца Папуа—Новая Гвінея. Але для гэтага трэба мець і настаўнікаў, якія здольны весці навучанне на кожнай канкрэтнай роднай мове. А такіх моў у гэтай дзяржаве — 867! Вось наколькі складанае рашэнне высакароднай задачы, якая пастаўлена ўладамі.

ІТАР—ТАСС.

СЁННЯ

СОНЦА

	Усход	Заход	Даўжыня дня
Мінск –	4.41	21.44	17.03
Віцебск –	4.22	21.43	17.21
Магілёў –	4.30	21.34	17.04
Гомель –	4.37	21.21	16.44
Гродна –	4.58	21.58	17.00
Брэст –	5.07	21.49	16.42

МЕСЯЦ

Першая квадра 1 ліпеня.
З 12.13 — 8-ыя месяцавыя суткі.
З 2.06 Месяц — у сузор'і Шаляў.

ІМЯНІНЫ

Пр. Ляонція, Іпація, Феадула
К. Аттона, Галіны, Марціна

НАДВОР'Е

Сёння ўдзень па рэспубліцы захаваецца воблачнае з праясненнямі надвор'е, на большай частцы тэрыторыі часам дажджы, навальніцы. Тэмпература паветра ў Гродне і Віцебску — 18—20, Брэсце і Мінску — 19—21, Магілёве — 20—22, Гомелі — 21—23 градусы цяпла.

У наступныя двое сутак месцамі, пераважна па паўднёвай палавіне рэспублікі, пройдуць дажджы, навальніцы. Тэмпература ўначы — 9—14, удзень 17—22 градусы вышэй нуля.

*Сардэчна віншуем **КАСІМОЎСКУЮ Антаніну Аляксееўну** з 55-годдзем. Зычым, каб здароўе, радасць і шчасце суправаджалі Вас у жыцці. Няхай ніколі не старэць Вас даты, падзеі і юбілеі.*

З любоўю і павагай вашы сябры, хроснік.

Сядзіба

Выпуск № 22 (410)

Рубрыку вядзе Мікалай ЧАХОЎСКІ

ПЕРАПІСКА З ЧЫТАЧАМІ

Міхаілу КАНСКАМУ, Лепельскі раён

Каб стрымаць пладажэрку (начнога ці вячэрняга матылька), існуе нямала сродкаў. Мы не раз пісалі пра браджэнне кампотаў. Яны выдаюць такі пах, што ні адна асобіна не праляціць міма, абавязкова сядзе, каб даведацца, у чым справа. Гэта і трэба выкарыстаць. Літровы слоік запоўніць тым кампотам на трэць. Падвязаць у кроне яблыні (грушы, слівы, вішні) так, каб гарлавіна слоіка была не зверху, а з нахілам у 35—45 градусаў. Матылёк заляціць і сядзе ў лужыну — прабачце, у той кампот. Птушкі, якія любяць гэтых матылькоў, сядуць на край слоіка і праглынуць ворагаў саду.

У вас, вядома, ёсць малако. Часта гатуеце тваражок. А куды дзяваеце сыроватку? На корм свінням? Пастаўце хоць бы 0,5 літра разведзенай сыроваткі ў садзе. Прапорцыя такая: 0,5 л сыроваткі на літр вады. Вынесіце пад вечар у каструлі ў сад. Назаўтра там будзе махаць крыльцамі з дзесятак пладажэрак. Метад надзейны.

І абавязкова накіньце на ствол дрэва так званы лоўчы пояс. Гэта нейкая анучка ці шчыльная папера. Абгортваць ствол як мага шчыльней (ні адной дзірачкі!). Мацаваць дзвюма стужкамі — зверху і знізу. Шырыня гэтага пояса — да 15—25 см. Яго мэта — злавіць чарвячкоў.

Яніне АТАРАВАЙ, г. Орша

Няма ў прыродзе раслін, якія б не валодалі лекавымі ўласцівасцямі. Адны ў большай ступені, другія — у меншай.

Возьмем агурок. Ён на 97 працэнтаў складаецца з вады. Але гэта вадзіца — золата! У ёй шмат пекцінаў, што нармалізуюць дзейнасць страўніка. Клятчатка выводзіць з арганізма адвечнага нашага ворага — халестэрын. Той зялёненькі плодзік яшчэ і мачагонны, і жаўцягонны, і паслабляльны сродак. Больш за ўсё лекаў у свежым прадукце, але не намнога горш і кіслы. Зрэшты, ліст таксама лекар.

Патысоны і гарбузы амаладжваюць арганізм, не даюць яму старэць. Багатыя на мінеральныя рэчывы: калій, кальцый, жалеза, медзь, кобальт, магній. Стравы з гарбуза надзвычай «лёгкія», іх выкарыстоўваюць у якасці дыетычнага харчавання.

Сапраўдная кладоўка каштоўных прыпасаў — морква і бурачкі. Наогул усё, што мы гадуем на агародзе, ідзе і як харчовы прадукт, і як лякарства. Часам незаменнае.

Аляксандру ДУБОЎСКАМУ, г. Мінск

На памідорах круціцца ліст? Гэта, відаць, вынік «укусаў» фітафторы. Закруціцца ліст і ў бульбы. А яшчэ ў перцаў і баклажанаў. Фітафтора вельмі іх любіць. Але гэта закручванне крахёчкаў уверх (атрымліваецца нешта накшталт цыгарэты) можа быць і ад недахвату бору ці калію. У час апрацоўкі раслін бардоскай сумессю да раствору дадаваць настоены попел (літр на вядро вады) і буракс (5—10 грамаў на тое ж вядро). Нагадаем, што медны купарвас (ён уваходзіць у састаў сумесі) і бор ці борную кіслату трэба разводзіць у цёплай вадзе (да 45—60 градусаў). У халоднай і нават пакаёвай прэпараты не разыходзяцца.

Цыбуля ўтварае галоўкі. Яе мэтазгодна зберагчы ад атак несапраўднай мучністай расы хоць бы на працягу ліпеня. Тады цыбуліны будуць вельмі важкімі. І захаваюцца добра. Чым апрацоўваць? Надзейна дзейнічае «тапаз» і «фундазол». Колькі чаго даваць — на этыкетках. Вядро раствору хопіць на 1,5 соткі.

НАРАБІЎ ДОЖДЖ БЯДЫ

Цяжка сёння раслінам. Дождж, які ліў на працягу амаль двух тыдняў, ускладніў абстаноўку на градках. Зямля бы цэгла, нават вострая матычка не ўлазіць у гэты «бетон». А рыхліць трэба, бо карані хочуць дыхаць. Без паветра не будзе ўраджаю.

Можна ісці да мэты — рыхлага асяроддзя — маленькімі крокамі. Сёння кранучь зямлю зверху — на 2—5 см у глыбіню, пасля прайсціся яшчэ раз. Гэта неабходна зрабіць і па той прычыне, што пустазелле больш прывучанае да нягод і спаўна выкарыстае вільгаць, каб абагнаць культурныя расліны.

Хто ўзяў у рукі матычку, павінен памятаць, што каранёвая сістэма развітая не вельмі. З грудкай зямлі можна лёгка вывернуць на паверхню і дарагую нам сцяблінку, скажам, морквы. Таму ля самага радочка матычку запускаем неглыбока. І толькі адступіўшы на 3—5 см, можам запусціць яе глыбей. Дайшлі да суседняга радка — зноў больш мелкае «плаванне». Абавязкова выбіраем пустазелле і кладзём у яму для кампосту.

Пустазелле і збітая глеба не адзіны клопат дачніка. Відаць, будзе патрэба ў дадатковых падкормках азотнымі ўгнаеннямі — настоеным каравяком, мачавінай, салетрай, сернакіслым амоніем. Што будзе пад рукой. І зрабіць гэта ў бліжэйшы выхадны.

«А фосфар і калій?» — спытаецца нехта. Гэтыя два элементы не вельмі рухавыя ў глебе. Яны бы прыліпаюць да зямлі-карміцелькі. Трымаюцца доўга. І не вельмі хутка знікаюць з верхняга гарызонта (15—25 см). А вось з мікраэлементамі могуць быць праблемы. Таму разам, скажам, з мачавінай (18 г) на вядро вады дабаўляць паўлітровы слоік ці нават шклянку прасеянага попелу. Зрэшты, у гэтым попеле будзе фосфар (7 працэнтаў) і калій (40 працэнтаў).

У асобных месцах (званілі са Смалявіцкага раёна) бурныя патокі вады вымылі нават цыбуліны. Іх пазнаходзілі ў канавах. Зноў пасадзілі. Пыталіся, ці будуць расці. Будуць, але вельмі марудна. З тых цыбулін і іншых культур трэба было зняць палову зялёнага лісця. Карані старанна выпрастаць. Калі будуць загібанні ў глебе, расліна адчуе дыскамфорт. Таму бурачкі, вымытыя з радкоў, трэба садзіць як расаду — адшчыпнуць трэцюю частку асноўнага кораня і амаль усе лісцікі, пакінуўшы толькі цэнтральныя.

Памідоры і агуркі падвязаць і падрыхліць, зняць пасынкі. Прарэджаныя дажджом агуркі прышчыпнуць над чацвёртым лістом. З пазухаў пойдуць атожылкі. З трох пакінуць два самыя моцныя.

Бульбу, калі палягла, падправіць і акучыць нанава. Можна і падкарміць: 20 г мачавіны і шклянку попелу на вядро вады. Але падкормліваць праз тры—пяць дзён пасля заканчэння дажджоў. Спачатку хай сама расліна выкарыстае ўсё, што ў яе засталося ў запасе.

ЛЕТНЯЯ ПРЫШЧЭПКА

Неўзабаве ў садзе закончыцца ўтварэнне новых лісточкаў. На канцы кожнага сёлетняга сучка ўтворыцца пупышка. Сам зялёны ганец усё больш будзе набываць уласцівасці не травы, а дрэва.

Вось якраз гэты перыяд пачатку выспявання галінак-аднагодак і выкарыстоўваць для летніх прышчэпак у прамысловых, сельскіх садах і на дачах. Яго лепшая пара — у другой палове ліпеня.

Нам патрэбны будуць дзічка і сяголетка-чаранок з сонечнага боку. Дзічку садзім вясною ці восенню. Яе не абразаем. Унізе ствала (15—25 см ад зямлі) павінна быць гэта прышчэпка — так званая акуліроўка.

Спачатку рыхтуем дзічку: чысцім кару анучкай, глядзім, ці не хворая наша абранніца, ці не пашкоджана на ёй кара. Калі заўважылі хібы, бракуем. На здаровым стволіку робім Т-падобны разрэз кары (толькі кары!). Акуліровачным нажом (тыльным бокам) аддзяляем кару ад драўніны. Гняздо гатова.

Цяпер бяром у рукі чаранок-сяголетку якраз таго сорту, які вам неабходна мець. Зразаем лісце з сярэдзіны, пакідаючы стрыжні ў 0,5—1 см. Пасля тым жа вострым акуліровачным нажом зразаем пупышку разам з карою і нашым стрыжнем. Робіцца ўсё адным рухам. Зрэзанае акуратна ўстаўляем у гняздо на стволіку дзічкі. Дабіваемся, каб пупышка з карою заняла якраз сваё месца. Застаецца абгарнуць цэлафанавай стужкай (прымяняецца для ізаляцыі) і замазаць раны і выступы садовым варам. Стужку накладваем знізу ўверх, пупышку пакідаем адкрытай. Усё, як паказана на малюнку.

Звычайна праз два тыдні (можа і болей) кратаем за наш стрыжань. Калі ён лёгка адвальваецца — значыць прышчэпка ўдалася.

Што вядзе да няўдач? Грэбаванне санітарнымі нормамі. Ні ў якім разе нельга брацца за свежыя зрэзы рукамі — ні на ствале, ні на чаранку. Браць толькі спелыя пупышкі. Не пачынаць работы ў пахмурнае надвор'е і тым больш у дождж.

Як кажуць, поспехаў вам!

ПАКУТЫ БАКЛАЖАНА

Хто не марыць мець на стале баклажаны? Плады, якія адліваюць чарнільна-цёмным колерам і таямнічай невядомасцю, падабаюцца многім. І ёсць за што, бо гэта культура багатая на розныя карысныя рэчывы. А яе здольнасць асвяжаць кроў нарадзіла не адну казку-легенду.

У нашых краях развіваецца з праблемамі, бо вельмі любіць цеплыню. Нават 20-градусная адзнака — ужо нязручнасць. Вось калі тэрмометр паказвае ў цяньку 23 і болей, тады справы ідуць добра. Таму і прывозяць да нас гэту экзатычную прадукцыю з поўдня Расіі і Украіны, ды яшчэ Малдавіі.

Пры тэмпературы ў межах 15 градусаў ападаюць кветкі і завязь. Працэсы развіцця спыняюцца. Ліст жаўцее. Новыя кветкі не ўтвараюцца. Таму на градку, дзе растуць баклажаны, абавязкова накінуць плёнку. Грунт павінен быць падсцелены слоем гною ў 25—35 см. Гэты гной для абагравання. Ён выдзяляе цяпло ў верхні слой, дзе ў агароднай зямлі размешчаны карані раслін.

Высокая патрабавальнасць баклажана да арганічнага рэчыва ў раёне каранёў. А яшчэ і вільгаці. Іх максімум патрэбны ў час цвіцення і налівання пладоў. Таму падкормкі арганікай (на вядро вады да двух кілаграмаў каравяку) абавязковыя. І гэтых падкормак не менш трох: як толькі высадзілі расаду пад плёнку і яна прыжылася, калі пачалося цвіценне і ў момант росту пладоў.

Можна арганіку замяніць на «хімію» — 20 г салетры, не менш як 40—50 г суперфасфату і 15—20 г калію. Усё на вядро вады (10 літраў). Вада абавязкова настоеная на сонцы ці падагрэтая да 30—35 градусаў. Калі мы акунаем у яе руку, то холаду не адчуваем. Увогуле, цяпла баклажану неабходна болей, чым агуркам і перцам.

Частыя палівы і сістэматычныя падкормкі вядуць да ўшчыльнення глебы. А баклажаны не цярпяць гэтага. Таму рыхленні як найчасцей. І даволі глыбокія. Толькі ў гэтым выпадку можна разлічваць на поспех.

Са шкоднікаў выдзелім каларадскага жука, які можа пранікнуць нават пад плёнку разам з гноем ці падкормкамі. З грыбковых хвароб найбольш дакучае фітафтора. Таму разам з бульбай і памідорамі апрацоўваем і баклажаны. Па меры пажаўцення зразаем ніжнія лісты.

Фота Анатоля КЛЯШЧУКА.

ВАДА П'ЕЦЦА...

ПАСЛЯ ЕЖЫ: ПРАБЛЕМА

ШУКАЦЬ, ПЛАЦІЦЬ або... «ЗАЙСЦІ ЗА ВУГАЛ»?

ЗАМЕСТ ЭПІГРАФА

«Он поет по утрам в клозете. Можете представить себе, какой это жизнерадостный, здоровый человек. Желание петь возникает в нём рефлекторно. Эти песни его, в которых нет ни мелодии, ни слов, а есть только одно «та-ра-ра», выкрикиваемое им на разные лады, можно толковать так:

«Как мне приятно жить... та-ра! та-ра!.. Мой кишечник упруг... ра-та-та-та-ра-ри... Правильно движутся во мне соки... ра-та-та-ду-та-та... Сокращайся, кишка, сокращайся... трам-ба-ба-бум!»

Юрый Алеша, раман «Зайздрасць».

Як «смачна» напісана, ці не так? Вы іранічна ўсміхаецеся, паважаны чытач? Тады адразу стаўлю дыягназ: не даспадобы вам доўгія прагулкі па прыгажуну-Мінску.

Прычым тут прагулкі? Усё проста да банальнасці.

Чалавек, як вядома, — істота разумная. І культурная (у асноўным). Але — жывая. Таму непрадказальная — у плане фізіялагічным, цялесным. Можна весці спартанскі лад жыцця, выпрацаваць у сабе ўмоўны рэфлекс і харчавацца не тое што па гадзінах — строга па хвілінах (а можна і зусім не харчавацца, толькі кефірчык папіваць, як некаторыя эстрадныя дзівы)...

Вось толькі ўласны ўнутраны «будзільнік» (скажам так) нам непадуладны — «звоніць» у самы непадыходзячы момант. Добра, калі вы дома, ці на рабоце, ці ў гасцях, ці ў тэатры і г. д., — пытанне можна вырашыць імгненна. Зусім іншая справа, сябры мае, калі ў момант «званочка» вы знаходзіцеся ў цэнтры горада. Брр... Дрыжыкі прабягаюць, як успомню мінулую нядзелю! Шалёныя думкі, дзе паблізу знайсці ўстанову, якая непазбежна прымае наведвальнікаў «пасля яды». Не такая лёгкая гэта справа, аказваецца.

Сказаць, што я была ў роспачы — значыць нічога не сказаць. Гэта быў амаль шок: дахаты ўжо не даеду, ніхто са знаёмых паблізу не жыве (уяўляю сабе карцінку: «Прывітанне, я прыйшла схадзіць у туалет»). Ну што, што рабіць нармальна выхаванаму чалавеку?.. На шчасце, успомніла, што побач з гандлёвым домам «На Нямізе» ёсць патрэбная мне ўстанова. Падбегам накіравалася туды. 2700 рублёў — хіба гэта лічба для біледіка ў рай? Гэта нішто ў параўнанні з пікантнай сітуацыяй, у якой магла апынуцца...

Пасля наведання запаветнага збудавання ўзнік шэраг пытанняў. Чаму, напрыклад, выпіць стакан мінералкі каштуе даражэй, чым, прабачце, «выліць» гэтую мінералку? Чаму ў платным туалеце адсутнічае папера — я не кажу пра шырока рэкламуемую па ТБ пяшчотную паперу «Зева», размова пра звычайную, самую танную. Чаму падпарадкаваны такой саліднай фірме туалет зусім не ў ідэальным парадку?

І ўвогуле, чаму так мала туалетаў у беларускай сталіцы?

Як паведаміў Юрый Субоцін, намеснік кіраўніка дзяржаўнага прадпрыемства «Трэст гардармеханізацыя», у сямі раёнах г. Мінска (выключаючы Першамайскі і Заводскі раёны) 46 туалетаў. Я не змагла ўтрымацца, каб не задаць лагічнае пытанне:

— Ці не замнога гэта — для сямі раёнаў сталіцы, Юрый Пятровіч?

— Я разумею, пра што пытанне... У свой час, калі новыя мікрараёны забудоўваліся, абавязкова прадугледжвалася будаўніцтва туалетаў. Хаця... Я назваў вам лічбу 46, але ад яе трэба адняць 12: менавіта столькі туалетаў закрыта. Некаторыя закрыты, таму што яны бесталкова пабудаваныя — далёка ад людных месцаў (паставілі туалет «у полі», туды людзі і не ходзяць: далёка, а да пад'езда бліжэй!).

ВОЧЫ Б НЕ БАЧЫЛІ!

Побач з Домам прэсы — лазня. З тыльнага боку вугал лазні ператварылі... у туалет. Не ўлады, не. Прахожыя, якім, што называецца, «прыперла». За гэтым інтымным заняткам іх ніхто не бачыць з вуліцы. Але якая карціна адкрываецца журналістам, калі ў пошуках натхнення яны глядзяць у акно! Рэакцыя на ўбачанае самая розная: адны лаюцца, другія спачуваюць бедалагам (паблізу няма ніводнага грамадскага туалета!), трэція спачуваюць работнікам лазні... Але ўсе з разуменнем ставяцца да кемлівых асоб, якім удаецца праскочыць праз міліцэйскі пост Дома прэсы, каб трапіць у адзін з рэдакцыйных туалетаў (праўда, некаторыя газеты прадбачліва «закадзіравалі» свае месцы інтымных адпраўленняў)...

— У рэальнасці дзейнічаюць 34 туалеты?.. — мне цяжка стрымаць здзіўленне.

— Ёсць туалеты на вакзалах (на аўтавакзале і ў Бабруйскім скверы ля чыгуначнага вакзала нашы туалеты). На рынках. Ёсць туалеты ў некаторых буйных магазінах.

НЕЛІРЫЧНАЕ АДСТУПЛЕННЕ

Студзень 98-га. Званок у рэдакцыю. У кафетэрыі магазіна (ці супермаркета?) «Еўрапейскі» кампанія студэнтаў бярэ па некалькі кубкаў кавы (а можа, і не толькі кавы) — сыплюцца ўражанні аб сесіі. «Схаджу туды, куды не ходзяць паязды» — дзяўчына адчыняе дзверы рашэтчатай агароджы (яна аддзяляе кафетэрый ад своеасаблівага кафэ), накіроўваецца да патрэбнага пакойчыка. Раптам яе спыняе афіцыянтка: «Вы куды? Не паложана!» Дзяўчына спрабуе патлумачыць, што ёй вельмі патрэбна, што яна толькі на хвілінку, і ніякай шкоды нікому не будзе. «Закажыце гарачае — і можаце ісці ў туалет». Быццам бы кафетэрый і кафэ знаходзяцца на розных планетах...

Ці ёсць яшчэ ў адной краіне «еўрапейскі» магазін, які прапускае сваіх пакупнікоў у туалет толькі пры наяўнасці гарачага?..

— Ці ёсць у Мінску бясплатныя туалеты?

— Усяго 9 платных туалетаў, астатнія — бясплатныя. Дарэчы, платныя туалеты даходаў не даюць (сродкі, якія збіраюцца, часткова ідуць на пакрыццё выдаткаў: вада, электраэнергія, праца прыбіральшчыц).

— У многіх краінах туалеты бясплатныя: гэта неабходны элемент нармальнага функцыянавання гарадскога жыцця (Італія, Ізраіль, Егіпет і г. д.).

— Не ва ўсіх краінах. Я быў у Польшчы, Германіі, Францыі — многія туалеты там платныя.

— Але, як паведамілі мне знаўцы, напрыклад, у Францыі праезд у транспарце каштуе 6 франкаў, туалет — усяго 1 франк. Суадносіны адзін да шасці. А ў нас талончык каштуе танней, чым схадзіць у туалет.

— Не, на 100 рублёў танней — 2,5 тыс. рублёў... Але, я гаварыў, платныя туалеты зроблены не дзеля кампенсацыі выдаткаў (гэта дробязі), а ў асноўным дзеля таго, каб прыпыніць выпадкі вандалізму. Напрыклад, у туалеце, што ў Цэнтральным скверы (ля Купалаўскага тэатра), зрабілі рамонт, памянялі сантэхніку — туды можна было нармальна зайсці. А ў што ператварылі бясплатны туалет літаральна за месяц? Усё разбілі. Усё, што можна было зняць, — знялі. А туалет па вул. Леніна, 5 (насупраць ГУМа) — быў бясплатны, але туды страшна было зайсці. Зрабілі платным, пасадзілі чалавека — спыніліся выпадкі вандалізму (інакш гэта не назавеш!). Бясплатным туалетам, канешне, патрэбен добры рамонт.

— На аўтавакзале туалет бясплатны?

— Так. У скверыку на Бабруйскай — платны. Ля чыгуначнага вакзала падземны туалет па прычыне крайне нездавальняючага стану (там былі і прамашкі праекціроўшчыкаў), зачынены, пабудаваны туалет крыху далей, у скверыку.

НЕАБХОДНАЕ АДСТУПЛЕННЕ

Зрабіць экскурсію ў туалет, што ў Бабруйскім скверыку, не ўдалося: ён быў зачынены на санітарную гадзіну (з 8.00 да 9.00 — відаць, у туалеце ўзорны парадак). І ўсё ж можна паспачуваць пасажырам: туалет знаходзіцца далекавата і ад білетных кас, і ад выхаду да цягнікоў. Можна паспачуваць і тым, хто прыязджае да нас з замежжа: не ўсе маюць беларускія грошы, каб аплаціць туалетныя паслугі. Значыць, напачатку трэба знайсці абменны пункт, набыць беларускія рублі, а потым... А потым, можа, ужо і туалет не спатрэбіцца?

— У чыёй гэта кампетэнцыі — адкрыццё туалета ў цэнтры Мінска, скажам, ад кінатэатра «Кастрычнік» у бок «Усхода» — тут вялікая сетка магазінаў і магазінчыкаў, кавярні, мноства кіёскаў і «парасончыкаў» са столікамі, дзе прадаюцца прахаладжальныя напіткі. У некаторых краінах крама або фірма, якая гандлюе адпаведным таварам, павінна забяспечыць чалавеку мыццё рук і магчымасць, прабачце, аблягчыцца пасля яды ці пітва.

— У цэнтры горада пабудаваць новы туалет практычна немагчыма. Аднак ёсць фірма, якая выпрабляе біятуалеты.

— Мала хто ведае, што гэта такое.

— Гэта безканалізацыйны туалет, за кошт біялагічных дабавак адбываецца расшчапленне цалкам усяго (чыста, без паху). Пад'язджае машына — калі не памыляюся, 350 літраў ёмістасць. Відаць, гэта і будзе вырашэннем праблемы для цэнтра горада.

— Мабыць, гэта не таннае «задавальненне»?

— Адзін туалет каштуе каля 100 мільёнаў рублёў, не так і дорага. Скажам, калі гандлёвая фірма, тыя ж «парасончыкі», набудуць біятуалет, зробяць платны ўваход — нават 3 ці 5 тысяч рублёў. Гэта было б разумна. Дарэчы, ў час свята горада два біятуалеты будуць устаноўлены ля Палаца спорту.

— Значыць, усе жадаючыя змогуць...

— Не. Усе, напэўна, не змогуць.

— ???

— Напэўна, вельмі шмат будзе жадаючых: адбудзецца свята піва, 13 заводаў выставяць сваю прадукцыю...

Што будуць рабіць тыя, каму не пашчасціць трапіць у біятуалет? Магчыма, перад імі паўстане пытанне, вынесенае ў загаловак.

Уладзя ТАЦЦЯНЧЫК.

УСЁ ПРА ЎСЁ

«РУСКІ БАЛЬЗАМ» ДОКТАРА ІЗОТАВА

Аўсяны кісель... Яго рэцэпт ведалі яшчэ нашы продкі, таму здаўна лічылася, што аўсяная каша дапамагае захаваць прыгажосць, а кісель — юнацкасць і бадзёрасць.

Аднаўляе імунітэт, паляпшае абменныя працэсы, дапамагае пры лячэнні інфаркту міякарда, хвароб страўніка, печані, дыябету. Гэтае немудрагелістае блюда раяць тым, каму за пяцьдзесят.

Гэты цуда-кісель атрымліваецца ў выніку браджэння. Такіх рэцэптаў не знойдзеце ў сучасных кнігах, але ў старых выданнях нешта падобнае ёсць. Трохлітровы слоік засыпце на адну трэць ці палову геркулесам або драбнёнымі аўсянымі крупамі і даліце даверху гатаванай ахаладжанай вадой. Дабаўце невялікі кавалак жытняга хлеба або паўшклянкі кефіру і пастаўце брадзіць на двое сутак. Малочнакіслая закваска значна палепшыць смак кісялю.

Калі сумесь перабрадзіла, працадзіце яе праз друшляк у эмаліраваную каструлю, пажадана 5-літровую. Грубую частку сумесі, якая засталася ў друшляку, прамыць яшчэ некалькі разоў невялікімі порцыямі халоднай гатаванай вады, дабавіць вадкасць у каструлю. Дайце гэтаму раствору адстаяцца 12—16 гадзін. Праз гэты час у каструлі ўтварыліся два слоі: верхні — вадкі і ніжні — густы асадак. Вадкасць асцярожна, не ўзбоўтваючы асадак, зліць (лепш яе адсмактаць з дапамогай гумавай трубкі), а асадак (500—600 мл) змясціць у слоік, закрыць накрыўкай і паставіць у халадзільнік. Гэта, калі можна так сказаць, канцэнтрат кісялю.

А зараз — як прыгатаваць сам кісель. Некалькі сталовых лыжак (да 10) канцэнтрату размяшайце ў дзвюх шклянках вады. На невялікім агні, інтэнсіўна памешваючы, давядзіце да кіпення, а затым уварыць да жаданай гушчыні (звычайна дастаткова пяці хвілін). У канцы гатавання пасаліце і пакладзіце масла па смаку. Можна разліць кісель у формачкі, змочаныя халоднай вадой, але больш прыемна есці яго цёплым. Своеасаблівы кісляваты смак спалучаецца з малаком ці вяршкамі.

Неабходна толькі, калі ўжо пачалі, ужываць аўсяны кісель штодзённа, пажадана ранкам. Праз некалькі месяцаў вы адчуеце бадзёрасць, лёгкасць ва ўсім целе.

Да друку падрыхтавала Вікторыя КЛЯНОВІК.

ПРАДПРЫМАЛЬНАЯ ГАНДЛЯРКА

Фартуна, якая заўсёды ўсміхалася загадчыцы магазіна ў адной з вёсак Бабруйскага раёна, на гэты раз адвярнулася ад жанчыны. А вось супрацоўнікам міліцыі Бабруйска і Асіповіч сумеснымі намаганнямі ўдалося «рассакрэціць» таямнічую дзейнасць гандляркі і, як вынік, у чымсьці аблегчыць жыццё вяскоўцаў.

Як удалося высветліць у МУС, выйшлі на загадчыцу магазіна аператыўнікі ў ходзе аператыўных дзеянняў. Падазраецца жанчына ў злоўжыванні службовым становішчам. Злоўжыванне ж гэта вылілася ні многа ні мала — у 400 мільёнаў рублёў, якія, зразумела, пайшлі «ў актыў» загадчыцы магазіна.

Ігар ГРЫШЫН.

ВІНШАВАННІ

Віншуем **Іосіфа Іосіфавіча ПАЎЛЮКЕВІЧА** *з 60-годдзем.*

Пусть эта знаменательная дата в душе оставит добрый след. Желаем вам всего, чем жизнь богата, — здоровья, счастья, долгих лет.

Мазолевы, в. Оспа Браслаўскага раёна, Ялохіны, г. Мінск.

Віншуем **Таццяну Ільінічну ПАДЛІПСКУЮ** *з Салігорска з 40-годдзем. Жадаем моцнага здароўя на доўгія гады, сямейнага шчасця і дабрабыту.*

Бацькі, в. В. Сліва.

У дзень нараджэння, у светлае свята жадаем **ШВЕД Жэні** *здароўя і шчасця багата.*

Мама, тата, г. Мінск.

Віншуем з днём нараджэння любую і дарагую жонку, маму і бабулю **Зою Якаўлеўну ШУЛЬГА** *з в. Каўгары. Жадаем моцнага здароўя, доўгіх гадоў жыцця, шчасця, радасці.*

Муж, дзеці, унукі.

Віншуем з 50-годдзем **Валянціну Міхайлаўну ШАРКО**. *Жадаем шчасця, здароўя, дабрабыту.*

Родныя, в. Нізок.

Згублены дыплом № 036725, выдадзены Мінскім медвучылішчам № 1 на імя РАМАНКО Вольгі Эдуардаўны, лічыць несапраўдным.

ГАСЦЁЎНЯ

Дыктар № 1

Не ведаць гэтага чалавека нельга. Чатыры дзесяцігоддзі ён уваходзіць у мільёны нашых кватэр не госцем. З яго вуснаў грамадзяне СССР даведваліся аб галоўных падзеях і ў сваёй краіне, і далёка за яе межамі ў праграме «Час», а то, рэзка змяніўшы імідж, ён з'яўляўся з бакалам шампанскага сярод зорак эстрады ў «Блакітным агеньчыку» ці «Песні года». Ён быў майстрам на ўсе рукі. Чытаў навіны і рабіў рэпартажы, ствараў нарысы аб людзях мастацтва. Хаця чаму — быў? Ён застаецца такім жа — улюбёным у сваю работу, як у само жыццё. Нездарма на сёлетняй цырымоніі «Тэфі» Ігар Леанідавіч Кірылаў стаў лаўрэатам, напэўна, самай галоўнай намінацыі — «За асабісты ўклад у развіццё тэлебачання». Карэспандэнту «Звязды» ён даў эксклюзіўнае інтэрв'ю адразу пасля ўручэння прыза — васьмікілаграмовай статуэткі залатога Арфея.

— Ігар Леанідавіч, як склалася, што вы — акцёр па адукацыі, прыйшлі на тэлебачанне, сталі працаваць дыктарам, весці інфармацыйныя праграмы, дзе артыстычнасць, мякка кажучы, у тыя гады не віталася?

— Мой прыход на тэлебачанне — чыстая выпадковасць. З дзіцячых гадоў я хацеў быць рэжысёрам, ствараць фільмы. Я і ў ВГІК паступаў на рэжысёрскі факультэт, дзе паспеў правучыцца два з паловай месяцы. У гэты момант, а ішоў 1957 год, на Цэнтральным тэлебачанні, быў аб'яўлены конкурс дыктараў-мужчын, якіх тады быў яўны дэфіцыт. І ўжо праз дзве гадзіны пасля прагляду я вёў сваю першую праграму навін, якая называлася тады «Апошнія паведамленні». А яшчэ праз тыдзень раптам зразумеў, што гэта — тое, дзеля чаго трэба жыць, і тое, чаму можна прысвяціць сваё жыццё. Так з таго часу я і працую на тэлебачанні — так лёс, гасподзь Бог павёў мяне.

— Якія галоўныя якасці вы назвалі б галоўнымі ў вашай рабоце?

— Іх вельмі многа. Я заўсёды лічыў, што тэлебачанне — гэта мастацтва. Мастацтва быць самім сабой у самых розных абставінах, у якія ставіць цябе тэлебачанне. Таму, перш за ўсё, тэлевядучы павінен валодаць прыродным артыстызмам, і менавіта гэтым, а не проста акцёрскім майстэрствам. Гэта розныя рэчы. Трэба ўмець расказваць нават аб самых будзённых падзеях апантана, вобразна, арыгінальна. І гледачы цябе прымуць у такім разе, і твая справа будзе захапляць цябе поўнасцю, яна будзе самай цікавай і патрэбнай справай у жыцці. Пры гэтым не трэба ставіць сябе вышэй за ўсіх — гледачы гэта адразу ж зразумеюць, трэба быць шчырым субяседнікам. Тады цябе палюбяць, прымуць і будуць давяраць.

— Але ж на рабоце часам даводзіцца выконваць тое, што не можа прынесці маральнага задавальнення...

— Я разумею, аб чым вы... Так, я вельмі не любіў весці праграму «Час» па чацвяргах, калі засядала Палітбюро ЦК КПСС. Але, з другога боку, ува мне прачынаўся спартыўны азарт: ці змагу я пераканаўча і даходліва прачытаць афіцыйную інфармацыю? І лепшай пахвалой было для мяне, калі наш сусед, Маршал Савецкага Саюза Яўген Якаўлевіч Савіцкі, казаў: «Ты так добра ўчора ўсё расказаў, што я сёння нават «Правду» не чытаў». Як я гэтага дабіваўся? Перш за ўсё, некалькі разоў прачытваў для сябе афіцыйную паперу, спрабуючы хоць неяк змякчыць, «ачалавечыць» жалезабетонныя фразы. Дарэчы, на наступны дзень у той жа «Праўдзе» тэкст «У Палітбюро ЦК КПСС» выходзіў менавіта ў маім варыянце, а не ў тым, які падрыхтавалі апаратчыкі ЦК партыі. Вось якой вялікай, магічнай сілай валодала тады праграма «Час».

— А «праколы». Ці былі яны ў вас?

— На жаль, не абышлося без гэтага. Неяк трапіўся вельмі складаны тэкст прамовы Андропава. Я адчуваю, што дзве часткі выступлення генсека неяк не звязваюцца паміж сабой ні па настрою, ні па логіцы. Зрабіў адзін дубль, другі. Запіс пайшоў у эфір. І тут толькі высветлілася, чаму было так цяжка: рэдактары пераблыталі і прыклалі да прамовы Андропава пару старонак выступлення нейкага маршала. Перапалох, самі разумееце, быў страшэнны. Я чакаў, што мяне звольняць, але абышлося вымовай з занясеннем «за фармальныя адносіны да работы».

— Ігар Леанідавіч, а што вы думаеце аб сітуацыі ў вашай краіне сёння?

— Яна складаная. Вельмі складаная. Калі б я быў палітолагам, я мог бы адказаць чаму. Але сам не магу разабрацца ў гэтым. Я адчуваю, што магчымасці зараз у Расіі каласальныя. І тое, што мы сталі на рынгачны шлях развіцця — гэта правільна, але ў гэтым сэнсе маглі б браць прыклад з іншых краін, напрыклад, з Кітая, дзе праходзяць тыя ж самыя працэсы, але дастойна, з цярпеннем. Галоўная ў гэтай рыначнай гонцы праблема — тое, што мы забыліся пра малазабяспечаных людзей, пенсіянераў. І зараз, здаецца, ужо позна штосьці мяняць, вось наша бяда — па-руску ўсё рабіць: спачатку разбурыць, а пасля шукаць выйсце. Спачатку трэба было думаць, куды і як мы пойдзем. Той цар добры, які думае пра народ — так даўней казалі. Гэтая ісціна правільная, на мой погляд, ва ўсе часы. Пра наша сённяшняе расійскае кіраўніцтва гэтага, на жаль, сказаць нельга.. Іх асабістыя амбіцыі бяруць верх над усім. Так што расіянам застаецца чакаць і спадзявацца на лепшае жыццё.

Думаю, што ваш прэзідэнт больш думае аб сваім народзе, хаця аб гэтым вам лепей меркаваць. Беларусы — незвычайны народ: такой далікатнасці, сціпласці і працавітасці я не сустракаў ніколі і нідзе. Я жадаю вам поспехаў у гэты нялёгкі час.

Гутарыла Вольга РАМАНЮК.

Самые добрые пожелания читателям газеты «Звезда» — братьям-белорусам! Искренне Вам И. Кирилов

Анатоль КРАСУЦКІ:

«САПРАЎДНЫ ПАЛІТЫК ПАВІНЕН ЗНАХОДЗІЦЦА Ў ТЫХ «ГАРАЧЫХ КРОПКАХ», ДЗЕ РОБІЦЦА ВЯЛІКАЯ ПАЛІТЫКА»

Сёння жаночая нацыянальная зборная па хакею на траве, складзеная ў асноўным на базе гродзенскага «Рытма», адпраўляецца на адборачны турнір да чэмпіянату Еўропы, які пройдзе з 5 па 12 ліпеня ў сталіцы Фінляндыі Хельсінкі. Кіраўніком спартыўнай дэлегацыі будзе Анатоль Красуцкі — дэпутат Нацыянальнага сходу Палаты прадстаўнікоў, ён жа — прэзідэнт Беларускай федэрацыі хакея на траве, выбраны на гэтую пасаду зусім нядаўна.

Напярэдадні ад'езду нашай каманды за мяжу журналіст «Звязды» задаў спадару Красуцкаму некалькі пытанняў.

— Анатоль Віктаравіч, прабачце, але многія аматары спорту разумеюць выбранне дэпутата ў прэзідэнты нейкай спартыўнай федэрацыі не інакш, як ролю «вясельнага генерала».

— Спадзяюся, што гэта не пра мяне. Я знаёмы са спортам, у прыватнасці з хакеем з шайбай, рускім хакеем і хакеем на траве, ужо не адзін дзесятак гадоў. У свой час нават гадоў 10 не развітваўся з канькамі: гуляў за юнацкую зборную рэспублікі і нават паспеў пабыць у камандзе майстроў. Дарэчы, і многія мае сябры — Канстанцін Карыцкі, Аляксандр Мацецкі ўсё сваё жыццё звязалі з хакеем на траве. А таму гэты від спорту для мяне не ў навіну.

— Намецілі ўжо план работы на будучае?

— Я даў згоду з мэтай максімальна садзейнічаць папулярнасці і развіццю гэтай дысцыпліны ў Беларусі, паколькі нашы і жаночая, і мужчынская клубныя каманды ўжо трапілі ў Лігу чэмпіёнаў, г. зн. будуць гуляць у еўрапейскай эліце. Да таго ж не трэба забываць, што хакей на траве — гэта алімпійскі від спорту, і яго ў свеце развіваюць 120 краін. Таму спадзяюся, што з боку дзяржавы і да хакея будуць адпаведныя адносіны.

— Трэба спадзявацца, што дэпутацкі мандат дазволіць вам вырашаць на «травяной» ніве хакея многія задачы.

— Не ўсё так проста ў гэтым жыцці. А таму не хацелася б казаць аб тым, што нам мора па калена. Але ж вы маеце рацыю: дэпутацкі статус дазваляе некаторыя пытанні вырашаць хутчэй, лабіраваць іх у парламенце і г.д. Пакуль для сябе намеціў вырашыць тры задачы. Першая — пашырыць матэрыяльна-спартыўную базу хакея на траве ў рэспубліцы. Мяркую на працягу сёлетняга года некалькі хакейных пляцовак рэспублікі аздобіць штучным пакрыццём. Ад гэтага колькасць жадаючых займацца толькі вырасце. Па-другое, арганізаваць масавую кампанію па папулярызацыі гэтай дысцыпліны ў сродках масавай інфармацыі. І, па-трэцяе, трэба знайсці нераўнадушных да хакея на траве людзей з ліку прадпрымальнікаў і дзяржслужачых, каб забяспечыць спартсменаў матэрыяльна: формай, амуніцыяй. Паўтаруся, што спачатку спорт патрабуе вялікіх грошай, а толькі потым дае аддачу.

— Тады звяртаюся да вас за прагнозам турніру ў Хельсінкі як да спецыяліста па хакею на траве. І яшчэ. Ці не будзе вас абавязваць пост прэзідэнта спартыўнай федэрацыі заўсёды быць гатовым выехаць за мяжу ў рангу кіраўніка спартыўнай дэлегацыі?

— Намёк зразумеў. Пачну з апошняга. Калі ёсць неабходнасць кіраўніку федэрацыі ехаць — трэба выкарыстоўваць гэтую магчымасць. Каб навесці кантакты, заявіць, што ёсць такая краіна. Спорт — гэта яшчэ і палітыка. А маё крэда: сапраўдны палітык павінен знаходзіцца ў тых «гарачых кропках», дзе робіцца вялікая палітыка. І я заўсёды стараюся быць там, дзе яна робіцца. Да таго ж мяне абавязвае да гэтага і мая пасада — я член Міжпарламенцкай асамблеі СНД. Увесь час у раз'ездах... Так што з адсутнасцю камандзіровак у мяне праблем няма. А таму без нейкай патрэбы ехаць нікуды не збіраюся.

Што датычыцца прагнозаў на хельсінкскі турнір, то даваць іх не буду. Спадзяюся, што напярэдадні 20-годдзя з моманту стварэння Беларускай федэрацыі хакея на траве нашы дзяўчаты змогуць зрабіць прыемны сюрпрыз і сабе, і рэспубліцы і заваяваць адну з трох пуцёвак, якія разыграюць паміж сабой 7 каманд кантынента, і трапіць у фінал, які пройдзе ў наступным годзе ў Германіі.

Уладзімір ЗДАНОВІЧ.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Рэгістрацыйны нумар 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.
Рэдакцыйная калегія: У. АНДРЫЕВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), І. БАРАНОЎСКІ, У. ГОЙТАН, Л. ЛАХМАНЕНКА, М. МІХАЕВІЧ (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. МЯСНІКОЎ, Л. РЫЖАНКОВА (намеснік галоўнага рэдактара), С. ШАЎЦОЎ.

НАШ АДРАС: 220013, гор. Мінск, вуліца Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда».
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай — 68-29-19; намеснікаў галоўнага рэдактара — 32-44-12, 32-14-25, 32-35-05; аддзелаў: інфармацыйна-аналітычнага — 32-38-02, 68-28-14, 68-29-68, эканомікі — 32-31-21, 68-29-68, палітыкі — 68-27-57, 68-28-64, культуры — 68-29-42, 68-28-27, сацыяльных праблем — 68-28-69, пісьмаў — 68-27-47, маралі і права — 68-28-51, міжнацыянальных адносін — 68-27-40, 68-28-69, журналісцкіх расследаванняў — 68-28-38, 68-28-72, знешнеэканамічнай дзейнасці — 68-29-44; аглядальнікаў па праблемах: навукі і адукацыі — 68-28-31, экалогіі і ліквідацыі вынікаў Чарнобыля — 68-28-36; уласных карэспандэнтаў: у Гродне — 33-25-29, Гомелі — 53-13-92, Баранавічах — 7-26-02, Магілёве — 31-13-75, Паставах — 26-562; бухгалтэрыі — 32-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах — 32-04-52, 32-31-98. ФАКС: 68-27-79. E-mail: daily@zwyazda.belpak.minsk.by. http://www.zvyazda-daily.minsk.by.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі.
Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з чытачамі.

Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку». Мінск, праспект Ф. Скарыны, 79.
Тыраж 85 556. Індэкс 63850.
Зак. № 3925.
Выходзіць 250 разоў на год.
Нумар падпісаны ў 20.15.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12